

**Патрыятызм — справа штодзённая**

СТАР. 3



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**




**Творы Быкава без цэнзуры**

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЧЭРВЕНЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 119 (27729) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ПАДТРЫМКА ПА АДРАСЕ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка здзейсніў рабочую паездку ў Чачэрскі раён Гомельскай вобласці. Гэтая паездка стала працягам размовы, пачатай падчас праведзенай 10 чэрвеня нарады з удзелам кіраўніка дзяржавы аб праектах указаў па ўдасканаленні аграрнай палітыкі, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы наведаў гаспадаркі «Отар» і «Зорка», якія ў апошні час дабіліся пазітыўных вынікаў у вытворчасці малака дзякуючы пераходу на круглагадовае стойлавае ўтрыманне жывёлы. Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на неабходнасці капіравання гэтага вопыту іншымі гаспадаркамі.

Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў важнасць стварэння ўмоў, пры якіх сяляне будуць мець «магчымасць аддаваць малако таму, хто прапануе найлепшыя цэнавыя ўмовы». Кіраўнік дзяржавы таксама нагадаў кіраўніцтву Гомельскай вобласці і Мінсельгасхарча аб сваім даручэнні па стварэнні дзейсных механізмаў кропкавай падтрымкі паспяховых сельгасвытворцаў. Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання ў сувязі з гэтым было даручана паскорыць стварэнне спецыяльнага фонду, які прадугледжвае тэрмін вяртання пазычаных сродкаў не больш за 8 гадоў. «Мы будзем даваць грошы толькі тым, хто зможа іх вярнуць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

■ Парламенцкі дзённік

## ПЕНСІЙНАЯ СІСТЭМА ЎДАСКАНАЛЬВАЕЦЦА

**На заключным пасяджэнні чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сенатары прынялі шэраг законапраектаў, якія закранаюць пытанні пенсійнага забеспячэння, дзяржаўных манаполій краіны, правілы руху на дарогах, а таксама сферу міжнародных адносін.**

Па стане на 1 мая 2014 года ў Беларусі пражывае звыш 2,5 мільёна пенсіянераў — гэта больш за чвэрць усяго насельніцтва нашай краіны.

**Марыяна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны,** расказала журналістам пра некаторыя змены, што маюць дачыненне да сістэмы выплаты пенсій.

— У нас самы нізкі пенсійны ўзрост — 55 і 60 гадоў. Дзяржава і людзі, якія працуюць, бяруць на сябе абавязкі выплаты пенсій. Трэба сказаць, што тыя пенсіянеры, якія працягваюць працаваць (наш пенсійны ўзрост абсалютна нармальны для таго, каб работнікі працягвалі сваю працоўную дзейнасць), уваходзяць у катэгорыю работнікаў. Яны атрымліваюць абмежаваны аб'ём пенсіі і робяць адлічэнні ў фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. У рэспубліцы працуе больш за 620 тысяч пенсіянераў.

Марыяна Шчоткіна паведаміла, што адно са змяненняў мае на ўвазе павелічэнне страхавога стажу.

— Калі ў савецкія часы трэба было 5 гадоў плаціць страхавыя ўзносы, то цяпер іх трэба плаціць 10 гадоў.

Другі момант — гэта датэрміновыя пенсіі. Звыш 250 тысяч чалавек выйшлі на пенсію раней на 5, 10 і больш гадоў.

Міністр працы і сацыяльнай абароны нагадала, што ў 2009 годзе быў прыняты Закон «Аб прафесіянальным пенсійным страхаванні».

— У сувязі з практыкай прымянення Прэзідэнтам быў прыняты ўказ, у адпаведнасці з якім за людзьмі, што працуюць па спісах №1 і №2 і да 1 студзеня 2009 года выпрацавалі больш за палову сацыяльнага стажу, захоўваецца права выхаду на датэрміновую пенсію. За астатнімі, якія працуюць у такіх жа ўмовах, у адпаведнасці з Законам «Аб прафесіянальным пенсійным страхаванні», усе гарантыі таксама захоўваюцца, але, акрамя гэтага, уводзіцца яшчэ адно права. Згодна з ім, работнік самастойна вырашае: назапашваць датэрміновую пенсію ці атрымліваць грошы, якія штомесяц наймальнік налічвае на індывідуальны рахунак, у дадатак да сваёй зарплаты. Такім чынам, гэтае пытанне работнік і наймальнік павінны вырашыць на сваім прадпрыемстве.

У сувязі з тым, што ўнесены змены ў Працоўны кодэкс, цяпер будзе прымацца шэраг нормаў, якія маюць на ўвазе спрашчэнне і ўрэгуляванне пенсійнай сістэмы.

— Напрыклад, уласнікі маёмасці, тыя ж фермеры, плацяць штомесяц за сябе як за самазанятага, а таксама за тых работнікаў, што працуюць на гэтай ферме па грамадзянска-прававых дагаворах.

Акрамя таго, вызначана мінімальная заработная плата па краіне — гэта мае дачыненне, у першую чаргу, да індывідуальных прадпрымальнікаў (іх больш за 300 тысяч), якія выплачваюць узносы ў Фонд сацыяльнай абароны.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

## БРАКАНЬЕРАЎ ПАКАРАЦЬ БУДЗЕ ЛЯГЧЭЙ

**З прыняццем праекта закона, які прадугледжвае ўзмацненне мер адказнасці за правапарушэнні ў сферы палявання і рыбалоўства, даказваць незаконную здабычу жывёл стане неабавязковым, бо Крымінальны кодэкс прапануецца дапоўніць артыкулам, які прадугледжвае адказнасць за незаконнае перасоўванне (транспарціроўку) і (або) разбіранне паляўнічых жывёл.**

**Міністр лясной гаспадаркі Беларусі Міхаіл АМЕЛЬЯНОВІЧ** запэўніў дэпутатаў, што дадзены законапраект дазволіць знізіць колькасць правапарушэнняў у сферы палявання і рыбалоўства, бо не дасць пазбегнуць адказнасці тым браканьерам, у дачыненні да якіх даказаць факт незаконнай здабычы жывёл немагчыма.

Прапануецца ўзмацніць крымінальную адказнасць пры паўторнасці такога парушэння на працягу года пасля накладання адміністрацыйных санкцый. Сюды ж адносяцца выпадкі, калі гэтае парушэнне адбылося ў запаведніку, нацыянальным парку, заказніку або на радыеактыўна забруджанай тэрыторыі, дзе ўстаноўлены кантрольна-прапускны рэжым. Артыкул будзе распаўсюджвацца і ў тым выпадку, калі вінаваты загадзя ведаў, што жывёла ўключана ў Чырвоную кнігу. Санкцыі прадугледжваюцца таксама і за разбіранне і транспарціроўку жывёлы, калі яе кошт у сто і больш разоў перавышае памер базавай велічыні. Максімальнае пакаранне па артыкуле — да 4 гадоў пазбаўлення волі з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю.

Узмацняецца адказнасць і за адпаведныя адміністрацыйныя правапарушэнні. Напрыклад, незалежна ад назначанага спагнання або вызвалення ад адміністрацыйнай адказнасці прапануецца прымяняць спецыяльную канфіскацыю незаконных прылад палявання і здабычы рыб і водных жывёл, гандаль якімі ажыццяўляўся ў неўсталяваных месцах, а таксама незаконных прылад збору грыбоў і іншых дзікіх раслін і іх частак.

Дзеючым заканадаўствам прадугледжана ў такіх выпадках канфіскацыя азёрна-рачной рыбы. Гэтую норму прапануецца дапоўніць канфіскацыяй іншых водных жывёл (ракі, малюскі і іншыя водныя беспазваночныя), каб зменшыць выпадкі рэалізацыі незаконнай здабычы.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X
14119

## «У РОДНЫМ КРАЮ ЁСЦЬ КРЫНІЦА»



**Паварот з лясной дарогі на крыніцу нічым не пазначаны, але некалькі прыпыненых легкавушак падказваюць, што помнік прыроды дзесьці побач. І сапраўды, акурат за ўзбочынай, на самым ускрайку лесу прытуліўся да хвой драўляны буданок-шалаш. Побач — «карагод» лавак вакол вогнішча, крыху воддаль — прыземістая піраміда даху, якімі звычайна накрываюць крыніцы, масток. На невялікім плакаце-аншлагу пазначана: «Крыніца «Святая вада Дзегцяроўская».**

**Мне пашанцавала заспець каля крыніцы невялікую групу людзей, старэйшы з якіх — Эдвард Кожан — узгадаў легенду пра цудадзейнасць вады.**

**«Некалі адзін невідушчы чалавек знайшоў у лесе гэтую крынічку, памыў ёю свае хворыя вочы і раптам стаў бачыць. Пазней каля крыніцы пачалі сяліцца людзі. Гаспадар бліжэйшага хутара знайшоў скарб і, займеўшы за яго вялікія грошы, паехаў у Амерыку. Але там ён захварэў. Аднойчы ён убачыў у сне, што трэба ўзвесці ў лесе каля крыніцы храм, і перадаў грошы на будоўлю. І сапраўды, у 1910 годзе недалёка ад крыніцы была ўзведзена капліца. У ёй пасвяцілі крынічную ваду і нейкім чынам пераслалі яе ў Амерыку. Вада дапамагла хвораму паправіцца».**

**Эдвард Кожан падвёў да каменя, на якім высечана лічба «1910», паказаў кусцікі белых руж, якія ён уласнаручна пасадзіў вакол падмурка, што застаўся ад той капліцы, і каля крыніцы — каб упрыгожыць святое месца.**

**Да крыніцы Эдвард прыехаў разам з жонкай, дзецьмі, зяцем і нявесткай, унукамі. 10-гадовы Уладзіслаў і 7-гадовы Валерый вельмі ўважліва слухалі ўспаміны-расповеды свайго дзеда і з задавальненнем частаваліся гаючай вадой.**

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*Мёрскі раён.*

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Намеснік прэм'ер-міністра Пётр ПРАКАПОВІЧ:**

***«Без імпарту нельга. Мы павінны мець узоры замежных тавараў, каб ведаць, на што арыентавацца. Пры гэтым неабходна зрабіць усё магчымае, каб гандлёвыя сеткі спрабавалі ўзяць на рэалізацыю як мага больш беларускіх тавараў. Беларуская прадукцыя канкурэнтаздольная, і я ўпэўнены, што айчынныя прадпрыемствы могуць прапанаваць годную альтэрнатыву. Ніхто не будзе ўказваць гандлёвым аб'ектам, трымаць долю імпарту ў 85% або ў 15%. Аднак мы павінны ствараць такія ўмовы, каб беларускія тавары станавіліся больш якаснымі і канкурэнтаздольнымі».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.06.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10190,00 | ■ |
| Еўра | 13890,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 302,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 857,92 | ▲ |

## ЗАКАНАДАЎЧАЯ АСНОВА — ВАЖНЫ ФАКТАР СТАБІЛЬНАСЦІ І РАЗВІЦЦЯ ГРАМАДСТВА

*Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь РУБІНАВА А.М. на закрыцці чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання 26 чэрвеня 2014 года*

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя і журналісты!

Сёння завяршае работу чацвёртая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

За перыяд работы сесіі ў нашай краіне адбыўся шэраг важных падзей. Карыстаючыся магчымасцю, я хацеў бы нагадаць пра найбольш значныя з іх.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка 22 красавіка звярнуўся са штогадовым Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу. У гэтым праграмным дакуменце чырвонай ніткай праходзіць асноўная выснова аб тым, што моцная эканоміка і сумленная ўлада з'яўляюцца падмуркам незалежнасці нашай краіны і росквіту нацыі.



У ім кіраўнік дзяржавы вызначыў тры базавыя накірункі ў эканоміцы, на якіх неабходна засяродзіць увагу на цяперашнім этапе. Гэта — развіццё ўнутранага рынку, удасканаленне сістэмы кіравання эканомікай і ўсямернае развіццё і падтрымка канкурэнцыі. Многія з пастаўленых кіраўніком дзяржавы задач наўпрост звязаны з дзейнасцю заканадаўчай улады, таму палажэнні Паслання павінны стаць арыенцірам і для нашай з вамі працы.

Кіраўнік дзяржавы пастаянна надае самую пільную ўвагу праблемным пытанням сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, ніколі не ўтойвае сапраўднага становішча спраў у эканоміцы і заўсёды сумленна і своечасова інфармуе нашых грамадзян аб сітуацыі, якая складваецца ў ёй, і перспектывах развіцця.

У прыватнасці, на апошнім пасяджэнні Савета Бяспекі адбылася прынцыповая размова па найбольш актуальных пытаннях у галіне эканамічнай і сацыяльнай палітыкі. Прэзідэнт дакладна акрэсліў кола праблемных пытанняў, паставіў канкрэтныя задачы па канцэнтрацыі сіл на прыярытэтных кірунках і забеспячэнні якаснага росту эканомікі як неабходнай умовы павышэння дабрабыту нашых грамадзян.

СТАР. 2

## КУРСАМ НА ЎСТОЙЛІВАЕ РАЗВІЦЦЁ

*Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь АНДРЭЙЧАНКІ У.П. на закрыцці чацвёртай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання 26 чэрвеня 2014 года*

Паважаныя дэпутаты, запрошаныя і журналісты!

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь сёння, 26 чэрвеня 2014 года, завяршае работу чацвёртая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

Несумненна, цэнтральнай падзеяй сесіі стала выступленне ў Авальнай зале Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з Пасланнем беларускаму народу і парламенту. Дэталёвы аналіз развіцця сітуацыі ў краіне і свеце, дакладная пастаноўка мэт і задач для ўсіх галін улады сталі для нас зыходным пунктам ацэнкі як праведзенай ужо работы, так і планаў на перспектыву.

Здаровая і моцная эканоміка — галоўная гарантыя незалежнасці і фундамент працвітання Беларусі. Рэалізуючы гэты тэзіс кіраўніка дзяржавы, дэпутаты ў ходзе сесіі праводзілі сістэмную работу па ства-



рэнні ўмоў для больш поўнага раскрыцця ўнутраных рэзерваў эканомікі, павышэння актыўнасці айчынных вытворцаў на знешніх рынках, выкарыстання пераваг еўразійскай інтэграцыі.

Тут у першую чаргу трэба адзначыць рашэнні па фарміраванні спрыяльнага інвестыцыйнага клімату, развіцці прадпрымальніцтва, удасканаленні механізмаў кіравання эканомікай.

Пашырэнню дзелавой актыўнасці паслужыць прыняцце законапраекта «Аб рынку каштоўных папер». Дакумент цалкам адпавядае міжнародным стандартам, што стварае перадумовы для паспяховай інтэграцыі гэтага сектара эканомікі ў сусветную фінансавую сістэму.

Такія ж мэты маюць сур'ёзная карэкціроўка парадку ліквідацыі суб'ектаў гаспадарання, узмацненне абароны інтарэсаў інвестараў, крэдытораў, дзяржавы. Пазітыўную ролю тут прызначаны адыграць і рашэнні, накіраваныя на аптымізацыю дзейнасці судоў, якія разглядаюць эканамічныя справы, а таксама развіццё практыкі дасудовага разбору.

Гістарычнай вяхой ва ўмацаванні інтэграцыі на постсавецкай прасторы стала падпісанне Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе.

СТАР. 2

### КОРАТКА

Пачынае работу міжнародная канферэнцыя «Канстытуцыйны кантроль: сучасныя тэндэнцыі развіцця і ўдасканалення». Прывітанне яе ўдзельнікам накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Рабочы дзень з пятніцы 4 ліпеня пераносіцца на суботу 12 ліпеня. Беларусы адсвяткуюць Дзень Незалежнасці ў чацвер 3 ліпеня, а потым будуць адпачываць яшчэ тры дні — пятніцу, суботу і нядзелю.

Ва ўрачыстасцях у Мінску, якія адбудуцца 1-3 ліпеня, прадугледжваецца ўдзел ветэранаў з блізкага замежжа, а таксама Бельгіі, Ізраіля, Польшчы, ФРГ.

Беларуская чыгунка ўкараніла праграмнае забеспячэнне, якое дае магчымасць купіць праз інтэрнэт білеты на некаторыя цягнікі з дапамогай графічнай схемы размяшчэння месцаў у вагоне.

У Беларусі сярэдні памер пенсій у маі гэтага года склаў Br2 млн 330,3 тыс. Гэта ў 2,26 раза перавышае бюджэт пражытачнага мінімуму для пенсіянераў.

■ Надвор'е

## ЛЕТА ВЯРТАЕЦЦА Ў ВЫХАДНЫЯ

**У пятніцу тэрыторыя нашай краіны яшчэ застанецца пад уплывам вільготнай і халаднаватай паветранай масы, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму сёння ў многіх раёнах будуць ісці кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 14-19 градусаў, а па паўднёвым захадзе — да 21 цяпла. А вось на выхадныя да нас прыйдзе цёплае паветра з боку паўднёвага захаду Еўропы. У суботу будзе амаль без ападкаў, толькі месцамі па Віцебскай і Магілёўскай абласцях пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы і раніцай месцамі туман. Тэмпература паветра ў ноч на суботу складзе яшчэ толькі 4-10 цяпла, але ўдзень стане ўжо плюс 15-22 градусы, а па паўднёвым захадзе — да 25 цяпла. У нядзелю ўначы будзе без ападкаў, а раніцай і ўдзень месцамі па паўночным захадзе прагназуюцца кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Раніцай месцамі туман. Тэмпература ў ноч на нядзелю складзе плюс 8-15 градусаў, на ўсходзе — 5-7 цяпла. Удзень чакаецца ад плюс 18 градусаў па паўночным захадзе, да 28 цяпла — па паўднёвым усходзе краіны.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак наша краіна трапіць пад уплыў актыўнага атмасфернага фронту з поўдня Еўропы. Таму паўсюдна чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Сіноптыкі папярэджваюць, што ў гэты дзень месцамі магчымы моцныя ліўні і нават град. Пры навальніцах — істотнае ўзмацненне ветру парывамі да 15-20 м/с. Тэмпература паветра ў ноч на панядзелак павялічыцца да плюс 13-18 градусаў, удзень — 20-27 цяпла, а на ўсходзе нават да плюс 29 градусаў. Сур'ёзныя ападкі, а месцамі моцныя навальнічныя дажджы, чакаюцца і ў аўторак. Удзень у асобных раёнах град і парывісты вецер. У ноч на аўторак 12-18 цяпла, удзень — плюс 16-23 градусы, на ўсходзе прыгрэе да 24-27 градусаў. Дождж і цёпла, а значыць, агуркі пойдуць у рост...

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «Газет у краіне многа, АЛЕ ВОСЬ ТАКАЯ — РОДНАЯ, НА РОДНАЙ МОВЕ — АДНА»

**...Да паштовай скрынкі надоечы хадзіла не раз. Нешта пазнілася наша паштальёнка, не прыносіла «Звязды». А без яе і ў хаце ўжо неяк цёмна. Мы прывыклі да гэтай газеты: яна прыходзіць у нашу сям'ю больш за 40 гадоў.**

Шчыра скажу, неяк раз мы ёй здрадзілі — выпісалі іншае выданне, нейкі час пачыталі. А вось палюбіць ды прывыкнуць так і не змаглі. Больш за тое — прыйшлі да высновы, што газет у краіне многа, але вось такая — родная, на роднай мове — усяго адна.

Пра што мы ў ёй толькі ні чыталі і нават пра што ні пісалі! Я сама на старонках газеты распавядала, помню, пра сваіх цётак, якія моцна гаравалі ў жыцці, бо адны гадавалі дзяцей, але ж пры гэтым заўсёды спявалі... І праўдзівыя гісторыі ў рубрыку «...Народ на провадзе» не раз дасылала. А што — хай людзі пасмяюцца ці хаця б усміхнуцца! Гэта яшчэ нікому не зашкодзіла...

Некалькі разоў нам шчасціла і ў звяздоўскай латарэі, выйгравалі прызы. Гадзіннік з эмблемай газеты аддалі сыну, майку і бейсболку — унуку. Абодва з задавальненнем носяць і тым самым рэкламуюць нашу «Звязду» ў далёкім ад нас Краснаярску.

А муж мой да пенсіі працаваў у райспажыўсаюзе, усё жыццё захапляўся фатаграфіяй. Таму цяпер, нягледзячы на цяжкую хваробу, уважліва сочыць за працай Анатоля Клешчука, за «Фотасловам» Яўгена Пясецкага.

Радуе, што «Звязда» адлюстроўвае ўсе сферы нашага жыцця. Яна лечыць і вучыць, яна духоўна ўзбагачае і нават забаўляе. Да таго ж, як мне здаецца, мы вельмі дрэнна ведаем сваю гісторыю, яе творцаў, забываем мову. Нават вёска стала пераходзіць на рускую. А таму ўсё, што піша «Звязда», набывае яшчэ большую каштоўнасць. І не разумець гэта проста грэх.

**Аляксандра САРОКА,**
*в. Шашкі, Стаўбцоўскі раён.*

# ЗАКАНАДАЎЧАЯ АСНОВА — ВАЖНЫ ФАКТАР СТАБІЛЬНАСЦІ І РАЗВІЦЦЯ ГРАМАДСТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Безумоўна, важнай падзеяй стала для ўсіх нас падпісанне прэзідэнтамі Беларусі, Расіі і Казахстана ў Астане Дагавора аб еўразійскім эканамічным саюзе. Як адзначыў наш Прэзідэнт, гэты дакумент з'яўляецца хоць і кампрамісным, але важным крокам насустрач адзін аднаму Беларусі, Расіі і Казахстана. Галоўнае, што мы разам рухаемся наперад, знаходзячы ўзаемавыгадныя рашэнні.

Сёння рынак АЭП набірае абароты і з'яўляецца адным з самых перспектыўных, хуткарослых сусветных рынкаў. Дзякуючы падпісанаму дагавору з наступнага года ў Беларусі адкрываюцца новыя знешнеэканамічныя магчымасці, і мы павінны эфектыўна іх выкарыстоўваць у сваіх нацыянальных інтарэсах.

Сярод прыкметных падзей, якія адбыліся ў сесійны перыяд, я хацеў бы вылучыць (і думаю, вы са мной пагодзіцеся) чэмпіянат свету па хакеі. Мінск ніколі раней не праводзіў такога маштабнага спартыўнага мерапрыемства сусветнага ўзроўню. Рэспубліканскія органы кіравання і арганізацыі, Мінскі гарвыканкам, усе без выключэння структуры, задзейнічаныя пры падрыхтоўцы і правядзенні чэмпіянату свету па хакеі, спрацавалі проста бліскуча. Пра гэта сведчаць як захопленыя водгукі кіраўніцтва Міжнароднай федэрацыі хакея, каманд — удзельніц турніру, так і меркаванні простых балельшчыкаў, якія наведалі нашу краіну. Рэспубліка Беларусь у чарговы раз прадэманстравала свету гасціннасць, адкрытасць, ветлівасць нашых людзей, уменне годна і на самым высокім узроўні арганізоўваць падобныя мерапрыемствы. Усе нашы службы і наша грамадскасць паказалі сваю здольнасць працаваць зладжана, аператыўна і адказна на агульны вынік. Несумненна, гэты чэмпіянат стаў не толькі выбітным спартыўным мерапрыемствам, але і важнай палітычнай падзеяй, якая дазволіла шматлікім тысячам нашых гасцей адмовіцца ад стэрэатыпаў асцярожнага стаўлення да Беларусі, спрыяла шырокаму распаўсюджванню праўдзівай інфармацыі аб нашай краіне. Мы з вамі ведаем пра гэта не толькі са сродкаў масавай інфармацыі, але і непасрэдна з кантактаў нашых калег са сваімі замежнымі партнёрамі.

На жаль, разам з гэтымі станоўчымі момантамі ў апошні час па суседстве з намі працягваў разгарацца ачаг напружанасці. Вы разумееце, што я маю на ўвазе трагічныя падзеі ва Украіне. Нам, беларусам, немагчыма без болю ў сэрцы глядзець на тое, што адбываецца там. Бо ў многіх з нас ва Украіне жывуць родныя, блізкія, сябры і калегі.

Кіраўнік нашай дзяржавы неаднаразова гаварыў пра прычыны ўкраінскага крызісу, у тым ліку падчас візіту ў Кіеў на інаўгурацыю абранага прэзідэнта Украіны. Думаю, усе вы бачылі, які непадробны інтарэс у грамадзян, асабліва на постсавецкай прасторы, выклікалі заявы Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі па гэтым пытанні. З уласцівай яму сумленнасцю і адкрытасцю ён даў глыбокую ацэнку таго, што адбываецца ва Украіне, і выказаў сваё бачанне адносна рашэння ўкраінскага крызісу.

Савет Рэспублікі цалкам падтрымлівае заявы і намаганні кіраўніка дзяржавы, накіраваныя на спыненне канфлікту ва Украіне. Мы шчыра жадаем брацкаму народу гэтай краіны як мага хутчэй спыніць кровапраліцце і ўрэгуляваць узніклы канфлікт мірным, дыпламатычным шляхам.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Падводзячы вынікі работы Савета ў перыяд чацвёртай сесіі, я спынюся на асноўных кірунках нашай дзейнасці.

Перш за ўсё, аб выніках працы ў галіне нацыянальнага заканадаўства. У справаздачны перыяд мы разгледзелі 61 законапраект, распрацоўка якіх была абумоўлена неабходнасцю прававога рэгулявання грамадскіх адносін. Згадаю аб некаторых з іх.

У сферы канстытуцыйнага заканадаўства намі быў прыняты Закон «Аб беларусах замежжа», накіраваны на забеспячэнне салідарнасці беларусаў ва ўсім свеце, захаванне нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларускіх дыяспар і ўмацаванне іх сувязяў з Рэспублікай Беларусь. Гэты закон дазволіць актывізаваць нашы ўзаемаадносіны з суайчыннікамі, якія пражываюць удалечыні ад Радзімы.

Быў прыняты важны для нашага насельніцтва закон, які тычыцца дзейнасці гарадскога электрычнага транспарту і метрапалітэна, закліканы забяспечыць належныя ўмовы для пасажыраў і фарміраванне справядлівай тарыфнай палітыкі.

На абарону інтарэсаў грамадзян у сферы працы і спажывання накіраваны законы, якія тычацца пытанняў цэнаўтварэння, мінімальнай заработнай платы і вызначэння пражытковага мінімуму, закон аб натуральных манаполіях.

Кіраўніцтва нашай краіны займае жорсткую пазіцыю ў дачыненні да рознага роду карупцыйных праяў і незаконных схем прадпрымальніцкай дзейнасці. Чарговым важным крокам да выкаранення падобных негатыўных з'яў у нашым грамадстве з'явіўся прыняты на сесіі закон аб мерах па прадухіленні легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, і фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці.

Ведучы непрымірымую барацьбу з карупцыяй і злачыннасцю, наша дзяржава, разам з тым, праяўляе гуманізм у дачыненні да тых асуджаных, якія праявілі імкненне да выпраўлення, у поўнай меры ўсвядомілі свае правіны. Такім актам гуманізму з'явіўся закон аб амністыі, прыняты ў сувязі з 70-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Нашу краіну за мноства найпрыгажэйшых рэк і азёр часта называюць «Беларусь сінявокая». Але важная не толькі прыгажосць. У сучасным свеце водныя рэсурсы маюць стратэгічнае значэнне, і, безумоўна, вада — гэта наш нацыянальны здабытак. Таму асаблівае значэнне для ўсіх нас мае прыняты на гэтай сесіі новы Водны кодэкс Рэспублікі Беларусь, які ўсталёўвае асноўныя прынцыпы і правілы аховы вод і накіраваны на беражлівае выкарыстанне і захаванне гэтага прыроднага багацця.

Адным з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь быў і застаецца клопат пра здароўе грамадзян. Гэтая тэма хвалюе ўсіх без выключэння. Падчас працы сенатараў над законапраектам аб ахове здароўя ў Савет Рэспублікі паступіла каля 50 калектыўных зваротаў (якія змяшчаюць больш за 1000 подпісаў). Свае прапановы па паляпшэнні дзейнасці ў сферы аховы здароўя выказалі грамадскія і рэлігійныя арганізацыі, а таксама асобныя грамадзяне. Карыстаючыся выпадкам, хачу з гэтай трыбуны падзякаваць усім, хто, шчыра перажываючы за нашу краіну, уносіць свае заўвагі і прапановы па ўдасканаленні нацыянальнага заканадаўства.

Нароўні са здароўем, важнай умовай для ўсебаковага развіцця асобы з'яўляецца павышэнне адукацыйнага і інтэлектуальнага ўзроўню. У нас краіна чытачоў, і нашы грамадзяне актыўна карыстаюцца паслугамі бібліятэк. Прыняты закон аб бібліятэчнай справе накіраваны на ўдасканаленне абслугоўвання наведвальнікаў, забеспячэнне каардынацыі ўзаемадзеяння бібліятэк па такіх накірунках, як набыццё інфармацыйных рэсурсаў і аказанне электронных паслуг.

Я згадаў толькі аб некаторых прынятых законах, якія непасрэдна тычацца жыцця нашых грамадзян.

Паважаныя калегі!

У справаздачны перыяд была працягнута работа па ўмацаванні дагаворна-прававой базы міжнароднага супрацоўніцтва. Падчас сесіі Саветам Рэспублікі было ратыфікавана 35 міжнародных дагавораў.

Ключавымі сярод шматбаковых пагадненняў з'яўляюцца дакументы ў рамках «тройкі» — Беларусі, Казахстана і Расіі. Інтэнсіўнае развіццё інтэграцыйных працэсаў, пераход з 2015 года на больш высокі ўзровень супрацоўніцтва ў сувязі з пачаткам дзейнасці Еўразійскага эканамічнага саюза патрабуюць перагляду напрацаванай дагаворна-прававой базы Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, яе адаптацыі да новых інтэграцыйных рэалій. Саветам Рэспублікі ратыфікаваны шэраг міжнародных дагавораў, якімі карэкціруюцца дзеючыя пагадненні.

Па лініі Садружнасці Незалежных Дзяржаў на вясновай сесіі разгледжаны пагадненні аб міждзяржаўнай спецыялізацыі вытворчасці і паставак насення, а таксама аб кансалідаванай справаздачнасці нацыянальных гаспадарчых суб'ектаў.

Ратыфікаваныя двухбаковыя міжнародныя дагаворы ў розных галінах узаемадзеяння з Азербайджанам, Казахстанам, Расіяй, Таджыкістанам, Туркменістанам, Шры-Ланкой, Манголіяй і Балівіяй.

Сярод ратыфікаваных дакументаў адзначу пагадненне з Расіяй аб далучэнні Беларусі да выкарыстання навігацыйнай сістэмы ГЛОНАСС. Гэтае пагадненне дасць магчымасць знізіць залежнасць ад яе амерыканскага аналага — сістэмы GPS, з выкарыстаннем якой узнікалі праблемы. Падоўжана дзеянне пагаднення аб парадку выплаты мытных пошлін пры вывазе нафты, што важна для нафтаперапрацоўчай галіны Рэспублікі Беларусь.

Безумоўным прыярытэтам у нашай міжнароднай дзейнасці было ўмацаванне стратэгічнага партнёрства з Расійскай Федэрацыяй.

Дзякуючы сумесным намаганням Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі, пры непасрэднай падтрымцы прэзідэнтаў дзвюх дзяржаў у Мінску быў праведзены першы Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Гэтае мерапрыемства з'яўляецца сумесным укладам сенатараў дзвюх краін у развіццё міжрэгіянальнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі.

На мінулым пасяджэнні я ўжо інфармаваў вас аб ходзе і выніках гэтага Форуму. Нагадаю, што падчас работы Форуму Старшыня Савета Федэрацыі Расіі Валянціна Іванаўна Мацвіенка разам з кіраўнікамі расійскіх рэгіёнаў былі прыняты кіраўніком нашай дзяржавы. Гэтая сустрэча ў Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, у якой удзельнічалі таксама і нашы губернатары, мела вялікае палітычнае значэнне і стала цэнтральнай падзеяй усяго мерапрыемства.

Па выніках работы Форуму прынята выніковая заява, у якой зафіксаваны рэкамендацыі, накіраваныя на правядзенне ўзгодненай аграрнай палітыкі дзяржаў — членаў МС і АЭП, забеспячэнне харчовай бяспекі Саюзнай дзяржавы і ўніфікацыю нацыянальных заканадаўстваў у аграпрамысловай сферы. Удзельнікі Форуму прыйшлі да думкі аб неабходнасці нарошчвання сумесных намаганняў па павелічэнні экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі ў трэція краіны і развіцці вытворчасці экалагічна чыстай прадукцыі. Быў таксама падпісаны шэраг дакументаў, накіраваных на стымуляванне і садзейнічанне развіццю беларуска-расійскага міжрэгіянальнага супрацоўніцтва.

Вынікі Форуму пацвердзілі, што Савет Рэспублікі і Савет Федэрацыі могуць і павінны адыгрываць значную ролю ў збліжэнні рэгіёнаў дзвюх краін. Пакладзены добры пачатак гэтай работы, і цяпер важна гэтак жа паспяхова яе прадоўжыць. Прынята рашэнне правесці другі Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў 2015 годзе ў Вялікім Ноўгарадзе, прысвяціўшы яго пытанням прамысловай палітыкі. Хачу праінфармаваць вас аб тым, што работа па падрыхтоўцы другога Форуму ўжо пачалася. У мэтах прапрацоўкі арганізацыйных пытанняў у Савет Рэспублікі літаральна на днях прыязджала прадстаўнічая дэлегацыя Наўгародскай вобласці.

У сесійны перыяд мы актыўна ўдзельнічалі ў рабоце Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. На мінулым тыдні ў Брэсце адбылася 46-я сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, падчас якой значная ўвага была нададзена правядзенню мерапрыемстваў Саюзнай дзяржавы, прысвечаных 70-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Нашы сенатары паспяхова працавалі і ў Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД, Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскай эканамічнай супольнасці і Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. У красавіку ў Санкт-Пецярбургу парламенцкая дэлегацыя Рэспублікі Беларусь прыняла ўдзел у мерапрыемствах вышэйназваных асамблей. Сярод асноўных разгледжаных пытанняў адзначу мадэльную заканатворчасць і план мерапрыемстваў, прысвечаны 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Мы таксама прынялі ўдзел у міжнародным форуме «Еўразійская эканамічная перспектыва», дзе падзяліліся з калегамі сваім бачаннем інтэграцыйных перспектыў на еўразійскай прасторы. Там жа адбыліся сустрэчы з кіраўнікамі парламентаў Расіі, Казахстана, Малдовы і Таджыкістана.

Традыцыйна вялікая ўвага надавалася пашырэнню кантактаў з краінамі далёкага замежжа.

Развіццю ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Іранам быў прысвечаны афіцыйны візіт у нашу краіну парламенцкай дэлегацыі Ісламскай Рэспублікі Іран на чале са Старшынёй сходу ісламскага савета Ірана Алі Ларыджані. У рамках гэтага візіту адбыліся сустрэчы іранскай дэлегацыі з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, прэм'ер-міністрам і кіраўніцтвам Савета Рэспублікі.

Нашу краіну таксама наведала парламенцкая дэлегацыя Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі на чале са Старшынёй Нацыянальнага сходу Лаоса Пані Ятхоту. Для рэалізацыі патэнцыялу супрацоўніцтва бакі вырашылі больш актыўна выкарыстоўваць магчымасці парламенцкай дыпламатыі. Мэты і формы міжпарламенцкага супрацоўніцтва абедзвюх краін вызначаны ў пагадненні аб супрацоўніцтве паміж парламентамі Беларусі і Лаоса, якое было падпісана па выніках візіту.

Розныя аспекты беларуска-камбаджыйскага супрацоўніцтва, уключаючы развіццё міжпарламенцкіх кантактаў і ўмацаванне гандлёва-эканамічных сувязяў, былі разгледжаны на сустрэчы кіраўніцтва Савета Рэспублікі з прэм'ер-міністрам Каралеўства Камбоджа Хун Сэнам у рамках яго афіцыйнага візіту ў нашу краіну. Падчас перамоў беларускі бок звярнуў увагу на перспектыўнасць дружалюбнага ўзаемадзеяння дзвюх краін на міжнародных пляцоўках — у прыватнасці, у рамках Міжпарламенцкай асамблеі АСЕАН і Міжпарламенцкага саюза.

Дэлегацыі профільных рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, у склад якіх уваходзілі і нашы прадстаўнікі, здзейснілі плённыя візіты ў Латвію і В'етнам, падчас якіх былі намечаны перспектыўныя кірункі міжпарламенцкага ўзаемадзеяння.

Члены Савета Рэспублікі ўдзельнічалі таксама ў рабоце парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы і Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя. Несумненна, такія камандзіроўкі важныя і карысныя. Падчас рабочых сустрэч мы маем магчымасць напрамую давесці да замежнай аўдыторыі аб'ектыўную інфармацыю аб нашай краіне і дзейнасці Савета Рэспублікі.

Паважаныя калегі!

Як заўсёды, у мінулы перыяд вялікая ўвага надавалася далейшаму ўмацаванню ўзаемадзеяння з мясцовымі Саветамі дэпутатаў, аказанню ім канкрэтнай дапамогі, удасканаленню стылю і метадаў іх работы.

У гэтым годзе адбыліся выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў дваццаць сёмага склікання. Былі праведзены першыя арганізацыйныя сесіі, абраны старшыні. Нашы прадстаўнікі ўдзельнічалі ў рабоце ўсіх сесій Саветаў дэпутатаў абласнога ўзроўню і больш чым у 40 сесіях базавага і пярвічнага ўзроўняў.

У сувязі з мясцовымі выбарамі персанальны склад Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі абноўлены амаль на 60 працэнтаў. Ад кожнай вобласці ў яго ўвайшлі найбольш вопытныя старшыні Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў, уключаючы і сельскія Саветы.

Гэты год у нашай краіне абвешчаны Годам гасціннасці. У Беларусі ёсць практычна ўсё неабходнае, каб прыцягнуць турыстаў: багатая прырода, цікавыя аб'екты гісторыі, культуры і архітэктуры, унікальныя традыцыі і рамёствы. Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны мае як сацыяльна-эканамічнае, так і важнае палітычнае значэнне. У нас ёсць што паказаць і ёсць чым ганарыцца.

Гэтай праблематыцы быў прысвечаны семінар-практыкум у Гродне, арганізаваны з удзелам членаў Савета Рэспублікі. На ім разглядаліся пытанні захавання і развіцця культурна-гістарычнай спадчыны горада. Хачу адзначыць, што органы мясцовага кіравання і самакіравання Гродна надаюць вялікую ўвагу гэтаму кірунку работы, актыўна прыцягваючы прыватны бізнес, грамадскія арганізацыі і мясцовых жыхароў. Гэты станоўчы вопыт неабходна выкарыстоўваць і ў іншых рэгіёнах рэспублікі.

Адной з найважнейшых задач мясцовых Саветаў дэпутатаў з'яўляецца каардынацыя дзейнасці органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Сёння ў рэгіёнах праходзіць іх перарэгістрацыя, і нам ва ўзаемадзеянні з мясцовай уладай неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на актывізацыю іх работы. Трэба больш шырока прыцягваць прадстаўнікоў ТГС да вырашэння праблем мясцовага значэння, распаўсюджваць лепшыя прыклады іх працы. Гэта будзе садзейнічаць не толькі больш эфектыўнаму вырашэнню пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва, але і пераадоленню ў некаторай яго часткі пасіўнасці і сацыяльнага ўтрыманства.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Як заўсёды, значную ўвагу ў сваёй рабоце мы надавалі зваротам грамадзян і юрыдычных асоб. У справаздачны перыяд у Савеце Рэспублікі было разгледжана 120 зваротаў. Грамадзян хвалююць пытанні сацыяльнай абароны, працы, жыллёвай гаспадаркі, аховы здароўя, аховы сям'і, мацярынства і дзяцінства. Па-ранейшаму значнай застаецца колькасць скаргаў, якія тычацца забеспячэння законнасці і аховы правапарадку. Такіх зваротаў паступіла ў наш адрас каля 50. Па пытаннях, непасрэдна звязаных з кампетэнцыяй Савета Рэспублікі, было разгледжана 25 зваротаў, у ліку якіх 18 — з канкрэтнымі прапановамі па ўдасканаленні заканадаўства, у тым ліку шэсць калектыўных зваротаў, сем — з просьбай звярнуцца у Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь для праверкі канстытуцыйнасці прававых актаў.

Па электроннай пошце атрымана і дадзены адказы на 28 зваротаў. Членамі Савета Рэспублікі ў рэгіёнах разгледжана каля 600 вусных і пісьмовых зваротаў, праведзена каля 200 асабістых прыёмаў грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб, у час якіх прынята больш за 300 наведвальнікаў. Акрамя таго, у названы перыяд імі праведзена звыш 40 выязных асабістых прыёмаў грамадзян, падчас якіх было прынята больш за 100 чалавек.

Аналіз зваротаў паказвае, што ўзровень даверу грамадзян да парламента ў цэлым дастаткова высокі. Пра гэта сведчыць, у прыватнасці, павелічэнне колькасці зваротаў, якія змяшчаюць канкрэтныя прапановы па ўдасканаленні заканадаўства.

Умацаванню аўтарытэту Савета Рэспублікі сярод насельніцтва ў немалой ступені спрыяюць выступленні сенатараў у сродках масавай інфармацыі.

За перыяд цяперашняй сесіі членамі Савета Рэспублікі было апублікавана 135 матэрыялаў у 45 перыядычных друкаваных выданнях, у якіх асвятляліся наша заканадаўчая работа, міжпарламенцкае супрацоўніцтва, работа пастаянных камісій, Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання і іншыя пытанні.

Актыўнае ўзаемадзеянне са СМІ нам неабходна працягнуць і ў міжсесійны перыяд.

Паважаныя калегі!

Завяршаючы сваё выступленне, хачу адзначыць, што наша краіна ўпэўнена працягвае сваё пастапальнае развіццё. Дзякуючы дальнабачнай і ўзважанай палітыцы, якая праводзіцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам, у нас забяспечаны бяспечныя і камфортныя ўмовы жыцця і працы для кожнага чалавека. Намаганні і энергія нашага грамадства накіраваны не на палітычныя сваркі і баталіі, а на стварэнне, што з'яўляецца залогам паспяховага эканамічнага развіцця і павышэння ўзроўню жыцця грамадзян. У міжнароднай супольнасці ўсё больш умацоўваецца пазітыўнае меркаванне аб Беларусі як аб паспяховай і міралюбівай краіне, стабільным і надзейным партнёры для супрацоўніцтва.

Сваю лепту ў рэалізацыю гэтай палітыкі ўносіце і вы, паважаныя члены Савета Рэспублікі. Я шчыра дзякую вам за зладжаную, аператыўную і канструктыўную працу падчас чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі і жадаю далейшых поспехаў у вашай дзейнасці ў міжсесійны перыяд.

Ад усёй душы віншую ўсіх прысутных у гэтай зале з надыходзячым галоўным дзяржаўным святам — Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, які ў гэтым годзе супаў са знамянальным юбілеем — 70-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Упэўнены, што вы сумесна з кіраўніцтвам і жыхарамі сваіх рэгіёнаў годна сустрэнеце гэтыя знамянальныя даты, ахінаце цеплынёй і ўвагай нашых паважаных ветэранаў, правядзяце дні памяці і баявой славы для маладога пакалення, якое ніколі не павінна забываць, якой цаной здабыты нашым народам свабода і незалежнасць.

Моцнага вам здароўя, мірнага неба і новых здзяйсненняў на карысць нашай роднай Беларусі.

Дзякуй за ўвагу!

# КУРСАМ НА ЎСТОЙЛІВАЕ РАЗВІЦЦЁ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мы дасканала рыхтаваліся да гэтай падзеі, паслядоўна ішлі да яе, напружана працуючы ў рамках Саюзнай дзяржавы, Мытнага саюза, Адзінай эканамічнай прасторы.

Для паспяховага старту гэтага перспектыўнага геапалітычнага праекта давядзецца вырашыць значны аб'ём задач. Таму што інтэграцыя не самамэта — яе вынікам павінна стаць рэальнае паляпшэнне якасці жыцця людзей.

Для гэтага трэба, каб у новых умовах беларуская эканоміка працавала максімальна эфектыўна. Таму дэпутаты разам са спецыялістамі, практыкамі, экспертамі дасканала прапрацоўвалі кожны законапраект, кожную норму. Асабліва гэта датычылася пытанняў цэнаўтварэння, дзейнасці натуральных манаполій, развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій і паслуг электрасувязі. Разгледжаны комплекс законапраектаў, прызначаных істотна павысіць эфектыўнасць транспартнай сістэмы рэспублікі і тым самым садзейнічаць выкарыстанню геаграфічнага становішча Беларусі як канкурэнтнай перавагі.

Якаснае вырашэнне эканамічных пытанняў сёння немагчыма без уліку экалагічнага складальніка. З такіх пазіцый быў перапрацаваны Водны кодэкс Рэспублікі Беларусь, падрыхтавана новая рэдакцыя Закона «Аб ахове азонавага слоя». У мэтах рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў і захавання біялагічнай разнастайнасці ўзмоцнена адказнасць за правапарушэнні ў сферах палявання і рыбалоўства.

Правядзенне ўзважанай эканамічнай палітыкі дае магчымасць дзяржаве, нягледзячы на няпростыя знешнія ўмовы, паслядоўна, крок за крокам вырашаць сацыяльныя задачы, умацоўваючы тым самым грамадскую стабільнасць і давер да ўлады, што з'яўляецца значным фактарам устойлівага развіцця краіны.

На гэтай сесіі таксама прыняты шэраг крокаў па абароне эканамічных інтарэсаў і сацыяльных правоў грамадзян. У прыватнасці, будзе ўзмоцнена адказнасць работадаўцаў за нясвоечасовую выплату заработнай платы і абавязковых страхавых узносаў. Выпрацаваны новыя падыходы да ўстанаўлення мінімальнай заработнай платы, вызначэння пражытачнага мінімуму. Удасканалены механізм фінансавання прафесійных пенсій.

Найбольш рэзанансныя навацыі ў сацыяльнай сферы звязаны з аховай здароўя. Каменціруючы прыняты ў другім чытанні праект Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове здароўя», трэба, па-першае, сказаць аб устанаўленні дакладных гарантый права на бясплатную медыцыну, аб удасканаленні сістэмы прафілактыкі захворванняў і лекавага забеспячэння насельніцтва. Разам з тым мы не павінны забываць, што здароўе чалавека ў першую чаргу залежыць ад яго самога, ад яго гатоўнасці весці здаровы лад жыцця. У гэтым плане трэба яшчэ шмат працаваць. Праблема вострая, і за яе неабходна брацца ўсёй грамадой.

Важным вынікам сесіі стала прыняцце наспелых рашэнняў у галіне культуры. Перш за ўсё адзначу карэкціроўку заканадаўства ў такой значнай для духоўна-маральнага дабрабыту грамадства сферы, як бібліятэчная справа. З прыняццем праекта Закона «Аб беларусах замежжа» ўпершыню на заканадаўчым узроўні замацаваны асновы дзяржаўнай палітыкі ў галіне ўзаемадзеяння з беларускай дыяспарай.

Не пакінуты без увагі і пытанні павышэння агульнай культуры грамадзян. Гэта, напрыклад, датычыцца правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў, утрымання месцаў пахаванняў, захавання памяці аб продках.

У краіне з высокім узроўнем культуры, з моцнымі маральнымі ўстоямі існуе значна менш перадумоў для карупцыі. У той жа час мы выразна ўсведамляем, што абавязковай умовай барацьбы з гэтым небяспечным для любой дзяржавы злом з'яўляецца наяўнасць строгага заканадаўчага бар'ера.

Менавіта з гэтых пазіцый вялася работа па ўдасканаленні дзейнасці органаў, якія займаюцца спыненнем эканамічных злачынстваў. А ў цэлым на сесіі разгледжаны важкі пакет дакументаў па нацыянальнай бяспецы, забеспячэнні законнасці і правапарадку, што цалкам вытлумачальна: сучасныя пагрозы і выклікі патрабуюць новых падыходаў у барацьбе з гандлем людзьмі, тэрарызмам, адмываннем злачынных даходаў. Своечасовымі з'яўляюцца і рашэнні па забеспячэнні пагранічнай бяспекі, удасканаленні аператыўна-вышуковай дзейнасці.

Чарговым актам гуманізму з боку дзяржавы стала прыняцце Закона аб амністыі, прызначанага даць грамадзянам, якія зрабілі памылку, магчымасць пачаць новае жыццё.

Звяртаючыся да міжнародных аспектаў нашай дзейнасці, адзначу ратыфікацыю шэрагу пагадненняў у рамках Мытнага саюза і СНД. Заканадаўчае замацаванне атрымала супрацоўніцтва з Балівіяй, Казахстанам, Манголіяй, Расіяй, Таджыкістанам, Шры-Ланкой, іншымі краінамі ў сферах гандлёва-эканамічнага і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва, пенсійнага забеспячэння і адукацыі.

Дынамічна развіваліся і нашы міжпарламенцкія сувязі. Літаральна гэтымі днямі ў горадзе Брэсце завяршыла работу 46-я сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Парламентарыі абмеркавалі ход рэалізацыі мерапрыемстваў Саюзнай дзяржавы, прысвечаных 70-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Асаблівая ўвага пры гэтым была ўдзелена праблематыцы патрыятычнага выхавання моладзі.

З улікам сучасных рэалій тэма Вялікай Перамогі набывае асаблівую актуальнасць. Яна шырока гучала на дыскусійных пляцоўках міжпарламенцкіх асамблей СНД і ЕўрАзЭС, Парламенцкай Асамблеі АДКБ, дзе самы актыўны ўдзел прымала дэлегацыя Рэспублікі Беларусь.

Вялікая работа праведзена па падрыхтоўцы да маючай адбыцца штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Беларускім бокам ініцыіраваны і распрацаваны праект рэзалюцыі «Абарона і пашырэнне сацыяльна-эканамічных правоў у рэгіёне АБСЕ», а таксама шэраг паправак да рэзалюцый, якія плануецца разглядзець на пасяджэннях пастаянных камітэтаў гэтай арганізацыі.

Сёння пагрозы радыкалізму, тэрарызму, ваяўнічага экстрэмізму і наркатрафіка становяцца ўсё большым выклікам для міжнароднай супольнасці. Процістаяць ім можна толькі аб'яднаўшы намаганні. У чэрвені кіраўнікі парламенцкіх дэлегацый дзяржаў — членаў АДКБ у ПА АБСЕ на сустрэчы ў горадзе Маскве абмеркавалі прапановы па асноўнай тэме сесіі «Хельсінкі + 40: мэта — бяспека кожнага чалавека». Узгоднены пазіцыі і па іншых пытаннях. І ўжо заўтра наша дэлегацыя на чале з намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў Гумінскім В. А. накіруецца ў горад Баку.

Будзе таксама прадоўжана работа па лініі Міжпарламенцкага саюза, аўтарытэтнейшай арганізацыі, якая гэтымі днямі адзначае сваё 125-годдзе, Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя, Парламенцкай асамблеі Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва, парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы і іншых міжнародных арганізацый.

У стадыі прапрацоўкі — удзел беларускіх парламентарыяў у 35-й Генеральнай асамблеі Міжпарламенцкай Асамблеі АСЕАН, устанаўленне кантактаў з Лацінаамерыканскім парламентам.

Закранаючы двухбаковыя адносіны, асабліва адзначу пашырэнне дыялогу з краінамі Азіі. У красавіку Беларусь з афіцыйнымі візітамі наведалі парламенцкія дэлегацыі Ірана і Лаоса. У ходзе гэтых візітаў адбыліся плённыя перагаворы са старшынёй Сходу ісламскага савета Ісламскай Рэспублікі Іран Алі Ларыджані і старшынёй Нацыянальнага сходу Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі Пані Ятхоту. Дагаворна-прававая база беларускага парламента папоўнілася Пагадненнем аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і Нацыянальным сходам Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі.

Цяпер вядзецца работа над праектам Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і парламентам Дэмакратычнай Сацыялістычнай Рэспублікі Шры-Ланка, якое плануецца падпісаць у ходзе маючага адбыцца афіцыйнага візіту ў гэту краіну.

У чэрвені парламенцкія дэлегацыі нашай краіны наведалі В'етнам і Латвію. Прапрацоўваецца візіт у Грузію, а таксама правядзенне ў Арменіі восьмага пасяджэння Міжпарламенцкай камісіі па супрацоўніцтве з Нацыянальным сходам Рэспублікі Арменія.

У бліжэйшы час Беларусь плануюць наведаць парламенцкія дэлегацыі Венесуэлы, Ізраіля, Кітая, Малайзіі, Мексікі, Туркменістана.

Паважаныя калегі!

Мэта ўсёй шматпланавай дзейнасці дэпутацкага корпуса — умацаванне стабільнасці ва ўсіх сферах жыцця дзяржавы і грамадства, забеспячэнне ўстойлівага развіцця краіны.

Але галоўным залогам працвітання Беларусі з'яўляецца адзінства народа, у аснове якога наша гістарычная памяць, павага да подзвігу нашых бацькоў і дзядоў.

Нядаўна мы адзначалі Дзень Перамогі, а сёння ўся краіна рыхтуецца да святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У гэтыя месяцы дэпутаты сталі зачынальнікамі і ўдзельнікамі многіх патрыятычных акцый і дабрачынных мерапрыемстваў, рабілі ўсё, каб ні адзін ветэран Вялікай Айчыннай вайны не застаўся без увагі і клапату.

Значэнне гэтай работы немагчыма пераацаніць, і вельмі важна, што яна праводзіцца не толькі ў дні свят. Менавіта памяць аб той высокай цане, якую заплаціў наш народ за права самастойна вызначаць свой лёс, з'яўляецца невычэрпнай крыніцай сіл, неабходных для стварэння моцнай, суверэннай Беларусі.

Дазвольце мне, паважаныя калегі, падзякаваць вам за плённую працу і павіншаваць усіх прысутных з надыходзячым святам — Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і новых здзяйсненняў на карысць роднай Беларусі.

## ■ Парламенцкі дзённік

# БРАКАНЬЕРАЎ ПАКАРАЦЬ БУДЗЕ ЛЯГЧЭЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ПРЫМАЦЬ НАЗАД НЕЛЕГАЛАЎ

На заключным пасяджэнні чацвёртай сесіі дэпутаты таксама ратыфікавалі пагадненне паміж беларускім і расійскім урадамі аб рэадмісіі, якое накіравана на супрацьдзеянне незаконнай міграцыі.

— Рэадмісія азначае «прымаць назад», — нагадала калегам **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Ганна ЛЯВІЦКАЯ.** — Беларусь з'яўляецца адной з дзяржаў, дзе праходзіць маршрут нелегальнай міграцыі ў Заходнюю Еўропу. Непасрэднае суседства з краінамі Еўрапейскага саюза з'яўляецца галоўнай прычынай таго, што Беларусь у кантэксце незаконнай міграцыі разглядаецца як краіна-транзіт, а не краіна-прызначэнне. Паколькі паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй фактычна адсутнічаюць межы, дзеянне пагаднення распаўсюджваецца на «нелегалаў» з трэціх дзяржаў і асоб без грамадзянства, якія знаходзяцца на тэрыторыі абедзвюх краін.

Пагадненне было падпісана ў Мінску 15 лістапада 2013 года (дарэчы, для Беларусі ўжо трэцяе па ліку). Першыя два былі падпісаны з Казахстанам і Турцыяй.

## ЗАМЯНІЦЬ ГАЗ ПІЛАВІННЕМ

Чаканні ад другой ратыфікацыі — эканомія больш за 51 млн кубічных метраў газу ў год. Менавіта такі вынік паабяцаў парламентарыям **намеснік старшыні Дзяржстандарта — дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Сяргей СЯМАШКА,** прадстаўляючы праект закона аб ратыфікацыі пагаднення аб пазыцы паміж Рэспублікай Беларусь і Міжнародным банкам рэканструкцыі і развіцця. Размова ідзе пра суму ў $90 млн на рэалізацыю праекта «Выкарыстанне драўнянай біямасы для цэнтралізаванага цеплазабеспячэння».

Рэалізацыя праекта мае на ўвазе выкананне ў Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях рэканструкцыі 13 кацельных арганізацыі ЖКГ з іх пераводам на выкарыстанне драўнянага паліва. Плануемы тэрмін рэалізацыі праекта — да 2019 года. Тэрмін крэдытавання — 15 гадоў з адтэрміноўкай пачатку выплаты асноўнага доўгу на 5 гадоў. «Гэта вельмі выгадны для Беларусі крэдыт, — падкрэсліў Сяргей Сямашка, — бо стаўка па ім складзе менш за 1%». Зварот пазыкі плануецца ажыццявіць са сродкаў мясцовых бюджэтаў. Дынамічная самаакупнасць праекта павінна скласці менш за 12 гадоў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

## ■ Грошы

# Без афіцыйнага даходу па абменніках не паходзіш

**Падатковыя службы жадаюць атрымліваць інфармацыю, якая складае банкаўскую тайну. Падобная ініцыятыва была накіравана спецыялістамі Міністэрства па падатках і зборах у Мінфін, які распрацоўвае змены ў Падатковы кодэкс.**

Размова, у прыватнасці, ідзе аб магчымасці атрымання звестак аб валютна-абменных аперацыях грамадзян. У МПЗ нам растлумачылі, што гэта робіцца для выяўлення асоб, якія набываюць вялікія сумы замежнай валюты, але пры гэтым афіцыйных крыніц даходаў не маюць. Калі такая прапанова падаткавікоў будзе падтрымана ўсімі зацікаўленымі бакамі, а таксама ўхвалена кіраўніком дзяржавы, тады новаўвядзенне пачне дзейнічаць з першых дзён наступнага года.

Нагадаю, што сёлета ўжо былі ўнесены змены ў Падатковы кодэкс, у адпаведнасці з якімі банкі цяпер абавязаны прадастаўляць па запыце падатковых органаў звесткі аб крэдытах фізічных асоб. Гэтыя змены ў заканадаўства былі ўнесены з мэтай выяўлення падатковымі органамі тых, хто жыве «не па сродках».

**Сяргей КУРКАЧ**

# Ваенная тайна Ігара Пракапенкі



**Днямі ў Доме Масквы адбылося адкрыццё мастацкай выстаўкі карцін і фотаздымкаў дзяцей Севастопаля «Я помню, я ганаруся!». Работы прысвечаны 70-годдзю вызвалення горада-героя. У прэзентацыі выстаўкі прыняў удзел вядомы расійскі тэлевядучы Ігар Пракапенка. Ён — і вядучы праграмы «Ваенная тайна» на REN-TV цягам сямнаццаці гадоў, а таксама намеснік дырэктара па грамадска-палітычным вяшчанні.**

***— Сёння не губляе актуальнасці тэма фальсіфікацыі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Як вы ставіцеся да гэтага як журналіст, дакументаліст?***

— Увогуле, любая фальсіфікацыя — гэта дрэнна, а калі мы гаворым пра гісторыю, то асабліва. Як той казаў, няма больш непрадказальнай навукі, чым гісторыя. І гэтая непрадказальнасць нясе ў сабе пагрозу бяспецы любой краіны. Таму што гісторыя — гэта самаідэнтыфікацыя народа і тэрыторыі, якая называецца дзяржавай. Гісторыя ВАВ і фальсіфікацыя яе фактаў — тэма асабліва балючая. Мы не можам забываць тое, якія людскія страты былі ў Савецкага Саюза, бо гэта сорак мільёнаў. Нельга рабіць выгляд, быццам нічога не адбылося. Як і не можам прыняць версію, нібыта галоўным пераможцам той вайны былі Злучаныя Штаты Амерыкі, на тэрыторыі якіх баявых дзеянняў не было. Але сваіх дзяцей мы павінны вучыць таму, як усё было насамрэч. У нас жа ў кожнай сям'і нехта загінуў падчас Вялікай Айчыннай вайны. Таму мы проста не маем права дапускаць фальсіфікацыю гісторыі тых падзей. Так, вайна была даўно, але і сёння тэма тых падзей застаецца актуальнай.

***— Скажэнне гістарычных фактаў найбольш небяспечнае тым, што на іх выхоўваюцца новыя пакаленні. Ці магчыма неяк засцерагчы ад уплыву такой інфармацыі ва ўмовах яе даступнасці?***

— Ведаеце, гэта немагчыма. Калі мы гаворым пра нашых дзяцей, пра маладое пакаленне, то тут павінна быць правільнае выхаванне школы, дзяржавы. Забараняць нічога нельга, акрамя дзеянняў, якія могуць быць крымінальна пакараны. Ва ўсім астатнім трэба вучыць правільна разбірацца. Трэба, каб была магчымасць знаёміцца з усімі пунктамі гледжання, але галоўнае — наяўнасць ведаў, якія будуць дапамагаць адмяжоўваць праўду і фальсіфікацыю.

***— Зразумела, што скажэнне фактаў — гэта інфармацыйная вайна. Але каму і навошта патрэбна яна, калі мы гаворым пра гісторыю Вялікай Айчыннай вайны?***

— Я не прыхільнік тэорыі змоў, таму лічыць, быццам недзе сядзяць людзі ў цёмных кабінетах і нешта плануюць, несур'ёзна. Разам з тым трэба разумець: калі такі працэс адбываецца, то ёсць і тыя, каму гэта выгадна. Каму? Жыццё чалавечай цывілізацыі арганізавана так, што існуюць розныя дзяржавы, і ў кожнай свае інтарэсы. Яны не заўсёды супадаюць. Адсюль і вытокі такіх дзеянняў. Калі мы бачым у амерыканскіх альбо нямецкіх падручніках сваю трактоўку вынікаў Другой сусветнай вайны і ўдзелу ў ёй гэтых краін, то павінны разумець: яны стараюцца не супраць нас, а робяць гэта для сваіх дзяцей. Такім чынам яны даюць ім адчуванне магутнасці іх дзяржавы. Проста робяць гісторыю зручнай для сябе, не больш за тое.

> **Патрыятызм справа штодзённая. Хочаце жыць у сваёй дзяржаве добра — значыць, трэба кожнаму рабіць тое, што магчыма, для спраўджвання нашых жаданняў.**

***— Разглядаючы гэтую з'яву ў СМІ з пазіцыі прафесіяналізму і этыкі, як расцэньваеце такую дзейнасць?***

— З 1995 года выходзіць мая праграма «Ваенная тайна». І, ведаеце, я лічу, што журналістыка — вельмі складаная прафесія, бо галоўнае для прафесіянальнага журналіста — не ўменне прыгожа пісаць, знаходзіць «смажаныя» факты, а менавіта прафесійная этыка. Нельга падманваць і дапускаць скажэння інфармацыі. Нельга шкодзіць людзям, якія глядзяць тваю праграму. Я заўсёды памятаю пра тое, што тэлевізар уваходзіць у кожны дом, не пытаючы дазволу. Дастаткова проста націснуць кнопку на пульце. А каля экрана могуць сядзець дзеці, пажылыя людзі, неўраўнаважаныя і многія іншыя, пра што вельмі важна памятаць падчас працы над матэрыялам. Таму што зробленае табой можа па-рознаму адбіцца на іх лёсе, на іх светаўспрыманні. Пытанне этыкі павінна быць асновай для журналіста, які лічыць сябе прафесіяналам.

***— Скажэнне фактаў у друкаваных СМІ і ў інтэрнэце — гэта адно. А наколькі складана і магчыма рабіць гэта на экране?***

— Ёсць такое паняцце, як «чорны піяр». Чаго граху таіць, у масмедыя гэта цэлы напрамак, дзе існуе шмат спецыялістаў. Аднак, адказваючы на гэтае пытанне, мы вяртаемся да папярэдняга: журналісцкая этыка. Я нават не буду казаць «сумленны журналіст», таму што прафесіянал, безумоўна, павінен быць такім. Іншая справа, калі здараецца, што журналіст не да канца разабраўся ў тэме. І тут з'яўляюцца памылкі па неасцярожнасці. Аднак пры жаданні іх заўсёды можна выправіць, бо існуюць архівы, можна апытваць сведкаў, удзельнікаў падзеі. Крыніц інфармацыі безліч, трэба толькі правільна з імі працаваць. Журналіст павінен разумець, чаго ён хоча ад сваёй працы, пра што хоча сказаць людзям, а ўсё астатняе — справа тэхнікі.

***— Давайце пагаворым пра вашу праграму «Ваенная тайна». Ці лёгка ўдаецца здабыць патрэбную інфармацыю, прэтэндуючы на эксклюзіўнасць?***

— Для таго, каб праграма ці артыкул выклікалі інтарэс аўдыторыі, эксклюзіў, сенсацыйнасць і блізкія да гэтага рэчы — не галоўнае. Мая праграма выходзіць у эфір вось ужо 17 гадоў, і яна моцна мянялася з гадамі, бо іншым стаў я, запатрабаванні гледачоў і само жыццё. Важна заўсёды адпавядаць таму, што цікавіць аўдыторыю сёння.

Я ў больш выгадным становішчы, у адрозненне ад некаторых калег, бо наш праект існуе не першы год. Наша праграма стала брэндам, сутнасць якога крыецца ў маіх этычных прынцыпах. Папершае, я ніколі не падводжу крыніцу. Не захоча чалавек быць названым — яго прозвішча не прагучыць. Я разумею, што за кожным выпускам праграмы стаяць людзі, і нашы неасцярожныя дзеянні могуць мець наступствы: чалавек страціць працу, пасварыцца з начальствам альбо яшчэ нешта. Па-другое, акрамя таго, што я журналіст, я яшчэ і грамадзянін сваёй дзяржавы. І працуючы над кожным матэрыялам, я думаю, ці не будзе зробленае мной несці ўрон маёй дзяржаве. Не канкрэтным людзям, якія кіруюць дзяржавай, а маёй радзіме.

***— Пазіцыя патрыёта. Але ці не страціла сваёй вагі гэта паняцце ў наш час, стаўшы проста прыгожым словам?***

— Паняцце «патрыятызм» часта выкарыстоўваюць у самых розных кантэкстах, ад чаго і ўспрымаецца яно часам проста як прыгожае, гучнае слова. Аднак вазьміце тых жа амерыканцаў, у якіх патрыятызм праяўляецца штодзённа, на побытавым узроўні. Вы паспрабуйце з імі гаварыць пра тое, што ў іх нешта не так, — з вамі могуць проста адмовіцца размаўляць. Калі казаць пра тое, як сёння ў нас праяўляецца патрыятызм, то, на маю думку, ён — у жаданні жыць у сваёй краіне, ганарыцца ёю і не дазваляць яе крыўдзіць. Патрыятызм справа штодзённая. Хочаце жыць у сваёй дзяржаве добра — значыць, трэба кожнаму рабіць тое, што магчыма, для спраўджвання нашых жаданняў. І толькі такая тактыка з'яўляецца залогам для развіцця і працвітання нашых краін.

**Алена ДРАПКО.**

TV@R

# ЦУДЫ ЗДАРАЮЦЦА

## Свет уратуецца верай і надзеяй на новае жыццё

**Спявачка Жанет выпусціла новы кліп на кампазіцыю «You will be here» («Ты будзеш тут») у падтрымку сем'яў, якія не могуць займець дзяцей. Аўтарам ідэі відэакліпа выступіла сама артыстка, а вось песню напісалі яшчэ летась для адбору на «Еўрабачанне» шведскія кампазітары Юлва і Лінда Петэрсан.**

— Калі мне даслалі песню і прапанавалі ўдзельнічаць у конкурсе, я адразу адмовілася. Але праз нейкі час усё ж паслухала кампазіцыю, і ўзнікла ідэя, якую мы ўвасобілі ў кліпе. Ён прысвечаны сем'ям, што не могуць пакуль што мець дзяцей. І для мяне было вельмі важна рэалізаваць гэтую ідэю, — падзялілася перад прэзентацыяй Жанет. — Так склалася, што я прайшла адбор на «Еўрабачанне», заняла трэцяе месца і думала, як можна будзе падаць ідэю на конкурсе, але Бог падрыхтаваў мне зусім іншы шлях.

Кліп здымалі на працягу трох месяцаў у некалькіх рэгіёнах Беларусі. І нават калі разлічаны бюджэт відэа быў вычарпаны, то ўся здымачная група працягвала працу — настолькі ўсіх захапіла ідэя аўтара.

У аснове сюжэта — гісторыя маладой сям'і, якая чакае дзіця. Але жаданням маладой пары не суджана спраўдзіцца... Суцяшэнне і выйсце сям'я знаходзіць, вырашыўшы ўзяць дзяўчынку з дзіцячага дома. А праз некалькі гадоў, насуперак прагнозам медыкаў, здараецца маленькі цуд: сям'я ўзрадавана весткай, што ў іх будзе яшчэ і ўласнае дзіця... У кліпе пераплецена рэальнасць з нерэальнасцю. Сама спявачка выступае нібыта пасланніцай нябёсаў, якая дорыць сям'і кветку — сімвал нараджэння новага жыцця. Відэа вельмі кранальнае, і, мабыць, лепш адзін раз яго ўбачыць. Фінал пакідае надзею і веру ў тое, што цуды здараюцца, калі мы ў іх верым.



Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

— Аднойчы Жанет распавяла гісторыю, якая ўразіла мяне, — кажа маладая **рэжысёр Ганна ГЕРТ**, якая ўвасабляла ідэю спявачкі. — Спачатку я нават вырашыла, што трэба здымаць пра гэта фільм. А ў выніку мы гісторыю скарацілі, сціснулі і ўмясцілі ў тры хвіліны. Запрасілі выдатных акцёраў Ганну Хітрык і Паўла Харланчука на галоўныя ролі. І яны цудоўна справіліся з досыць складанымі задачамі, бо ў нас прысутнічаюць вельмі эмацыянальныя, у пэўнай ступені жорсткія сцэны. Без такіх эпізодаў мы не маглі абысціся, таму што, на жаль, такая рэальнасць жыцця. А ролю маленькай дзяўчынкі выканала рэальная выхаванка Бабруйскага дзіцячага дома Аліна.

У працэсе працы над кліпам самой Жанет пашчасціла сустрэцца і пазнаёміцца з многімі людзьмі, паспяховымі, здаровымі, прыгожымі, але пазбаўленымі самага галоўнага — магчымасці стаць мамай і татам:

— Я была ўражана маштабам праблемы. Аказваецца, у нашай краіне 17 працэнтаў людзей стаяць на ўліку па бясплоднасці! Размаўляючы з такімі людзьмі, я зразумела: у сітуацыі, калі нешта не атрымліваецца, галоўнае не страціць веру. А вера праяўляецца ў дзеяннях. Размаўляйце са сваім будучым дзіцем, прыдумвайце яму імя, распавядайце, як вы яго чакаеце і як будзеце разам бавіць час. І тады ўсё атрымаецца.

Пасля прэм'ернай дэманстрацыі кліпа апладысменты ў зале не сціхалі некалькі хвілін. Дарэчы, дзяўчынка Аліна, якая знялася ў кліпе, цяпер таксама знайшла сям'ю — яе ўдачарылі. Гэту падзею стваральнікі відэа лічаць добрым знакам і пацвярджэннем таго, што ўсё зробленае — не дарэмная праца.

— Не кожны артыст адважыцца закранаць вострыя тэмы такога кшталту. Таму пазіцыя Жанет заслугоўвае павагі, — выказаўся ў адрас гераіні вечара спявак Тэа.

Пятае па ліку музычнае відэа спявачкі ўжо можна ўбачыць у эфіры беларускіх тэлеканалаў, а таксама ў сацыяльных сетках. Плануецца яго ратацыя і ва ўсіх кінатэатрах краіны — кліп будуць паказваць перад пачаткам кінасеансаў.

**Алена ДРАПКО.**

■ Тэлесеткі

# БЕЛАРУСЬ ДЭЛЕГУЕ НА «ЕЎРАБАЧАННЕ» ДЗЯЎЧЫНКУ?

**Такі прагноз сёлета можна зрабіць загадзя — і з дакладнасцю ў 80% не памыліцца. Проста таму, што сярод 11 выканаўцаў нацыянальнага адбору на міжнародны дзіцячы конкурс «Еўрабачанне-2014» — ажно 9 дзяўчат!**

Усяго ж арганізатары атрымалі сёлета 48 заявак ад ахвотных прадставіць нашу краіну, але да разгляду журы дапусцілі крыху менш. «Некалькі заявак мы атрымалі з Расіі, — патлумачыла **кіраўнік рабочай групы нацыянальнага адборачнага тура дзіцячага «Еўрабачання-2014», выканаўчы прадзюсар тэлеканала «Беларусь 1» Людміла БАРАДЗІНА.** — А па ўмовах рэспубліканскага конкурсу «Песня для Еўрабачання», да ўдзелу ў ім у якасці выканаўцы дапускаюцца толькі грамадзяне Беларусі ці замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія не менш чым 2,5 года пражываюць у нашай краіне. Таму гэтыя заяўкі прафесійнае журы на чале з народным артыстам Беларусі, кампазітарам Эдуардам Зарыцкім не разглядала».

Пасля праслухоўвання выканаўцаў жыўцом суддзі вызначылі 10 фіналістаў. У іх лік трапілі 5 прадстаўнікоў сталіцы і Мінскай вобласці: Дар'я Атрошанка (Маладзечанскі раён), Антоній Канаплянік, Ганна Зайцава, Уладзіслава Дарашэвіч, Надзея Місякова (усе — Мінск), 3 прадстаўніцы Брэстчыны: Ганна Ермаковіч, Юлія Левіна (абедзве — Брэст) і Ангеліна Піпер (вёска Астрамечава), а таксама канкурсанты з Магілёўшчыны і Гродзеншчыны — Алена Цітова (Магілёў) і Ксенія і Павел Лашчэўскія (Слонім). Самым малодшым з патэнцыйных удзельнікаў дзіцячага «Еўрабачання» — па 10 гадоў, найстарэйшым — па 14. Частка юных артыстаў аматарам конкурсу ўжо добра знаёмая: так, Ангеліна Піпер, Надзея Місякова, Аня Зайцава летась ужо даходзілі да фіналу нацыянальнага адбору, Дар'я Атрошанка і Антоній Канаплянік паказалі гэткі ж вынік у 2012-м. Каму з іх пашанцуе сёлета, даведаемся падчас фінальнага гала-канцэрта, які пройдзе ў Мінску 29 жніўня. Яго пераможцу, які і прадставіць Беларусь на дзіцячым «Еўрабачанні», па традыцыі, выберуць сумесна тэлегледачы і прафесійнае журы. Сам жа конкурс, нагадаем, адбудзецца 15 лістапада ў мальтыйскім горадзе Валета.

# «МІР» ЗАПРАШАЕ Ў ЗЯМЛЯНКІ

**Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў тэлеканал падрыхтаваў 5 новых серый праекта «Партызанскі край». Гэты цыкл тэлефільмаў, які гледачы ўпершыню ўбачылі напрыканцы 2012 года, прапаноўвае панову паглядзець на гісторыю народнага супраціўлення акупантам у гады Вялікай Айчыннай вайны, распавядае пра невядомыя падрабязнасці баявых аперацый і рэалій партызанскага жыцця.**

Усё гэта — вачыма маладых вядучых Вольгі Рыцько і Мікалая Зіміча, якія ездзяць па месцах баявой славы і літаральна прымяраюць на сябе даўнейшыя падзеі: спрабуюць будаваць зямлянкі, гатаваць у палявой кухні, упраўляцца са зброяй і хадзіць у разведку...

Фармат новых серый, як адзначыў **прадзюсар праекта, лаўрэат шматлікіх «Тэлевяршынь» за фільмы ваеннай тэматыкі Генадзь САЛДАТАЎ,** практычна не зменіцца. У прыватнасці, тэлевізійнікі раскажуць і пакажуць, як дзейнічалі партызанскія аэрадромы, якім чынам народныя мсціўцы папаўнялі свой баявы арсенал, узгадаюць, адкуль бралі і як рамантавалі адзенне і абутак для партызанскіх атрадаў, а таксама распавядуць, чым займаліся дзеці ў партызанскіх атрадах і як працавалі «лясныя» школы...

«Тэму адзення для партызанскіх атрадаў мы ўжо неяк закранalі раней, але вырашылі да яе зноў вярнуцца і распавесці больш падрабязна, тым больш што хапае цікавых фактаў, — анансаваў некаторыя сюжэты «Партызанскага краю» Генадзь Васільевіч. — Асобна згадаем пра становішча дзяцей і падлеткаў у гады вайны, пра тое, як у памкненні перацягнуць моладзь на свой бок фашысцкія акупацыйныя ўлады стваралі нямецкія школы і ўбівалі ў галовы сваю ідэалогію. Але ў тыя школы ніхто хадзіць не хацеў, таму выкладалі ў іх у асноўным фізкультуру і нямецкую мову — каб былі здаровыя і маглі шмат працаваць... Вельмі цікавая і тэма партызанскай зброі — падчас паездак мы ўбачылі мноства ўнікальных яе ўзораў, не проста перарobленых, а літаральна сабраных наноў рэдкімі майстрамі-ўмельцамі. І, безумоўна, як і ў мінулых серыях, пастараліся па максімуму запісаць успаміны відавочцаў і ўдзельнікаў тых падзей, бо, на жаль, ветэранаў з кожным годам застаецца ўсё менш, і трэба паспець занатаваць тую жывую гісторыю, памяць, якую яны захоўваюць...».

Звышсенсацый стваральнікі «Партызанскага краю» не абяцаюць, але спадзяюцца, што глядзець фільмы будзе цікава, прычым не толькі беларускім гледачам, але і ў іншых краінах СНД. У эфіры «Партызанскі край» — з 30 чэрвеня па 3 ліпеня, а таксама 7 ліпеня.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 30 ЧЭРВЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 1.05** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.00** Клуб рэдактараў.
**10.55** «Зорнае жыццё». «Жорсткі раман».
**12.10** «Мая праўда». «Мішэль Мерсье. Рабэр Ассейн. Жыццё пасля «Анжалікі».
**13.15 Меладрама «Эгаіст».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Камедыя «Палёт фантазіі».**
**17.20** Нашы.
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**22.10** Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дак. цыкл «Яны спявалі за Радзіму».
**22.50** Футбол. Чэмпіянат свету. 1/8 фіналу.
**0.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**1.40** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 10.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 17.15 Серыял «Нож у аблоках». Заключная серыя.**
**10.35 Серыял «Разведка».**
**11.45 Фільм-казка «Садко».**
**13.10** «Два з паловай кухары. Адкрытая кухня».
**13.45 Фэнтэзі «Мой хатні дыназаўр».**
**15.50** Ток-шоу «Перазагрузка».
**16.30** Пад грыфам «Вядомыя».
**18.20** Футбол. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
**18.50** Футбол. Чэмпіянат свету. 1/8 фіналу.
**20.55** Дак. серыял «Азбука добрага самаадчування».
**21.25** КЕНО.
**21.35, 22.55 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**22.10** Час футбола. Рыа-2014.
**23.30 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**0.30** Тэніс. Уімблдон.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 13.40, 16.55, 21.05, 0.00** «Калейдаскоп».
**8.10, 13.50, 17.05, 0.10** «Сімвалы эпохі». «Тры сякеры» — партвейн «777».
**8.25, 14.05, 17.20, 0.25** «Галасы з мінулага». «Героі свяшчэннай вайны». Абаронца Брэсцкай крэпасці, Герой Савецкага Саюза Пётр Гаўрылаў.
**8.30 Дзіцячы фільм. «Гутаперчавы хлопчык».**
**9.45, 11.50, 14.40, 18.10** «Размаўляем па-беларуску».
**9.50, 22.00** «Аперацыя «Баграціён». Хроніка Перамогі. «Каны на Бярэзіне».
**10.20 «Ясь і Яніна». Маст. фільм.**
**11.25, 23.30** «Святло далёкай зоркі». Памяці опернага спевака Валерыя Глушакова.
**11.55** «На «біс!». Канцэрт цыганскага шоу «Алюр».
**14.10** «Дакрананне». Дак. фільм.
**14.45** «Плошча мастацтваў». Белая памяць... Паэт Мікалай Мятліцкі.
**15.15** «Беларускі космас». Дак. фільм.
**15.45** «Скарбніца Гомельшчыны». Мазырскае барока.
**16.10** «Мая настаўніца Айша». Дак. фільм.
**16.30** «Фабрыка цудаў». «Кампазітар». Дак. фільм.
**17.30** «Містыка ўлады». «Імператарскі асяродак».
**18.00** «Жыццё Тураўскага лугу». Дак. фільм.
**18.15** «Леанард Бернстайн. Роздум». Дак. фільм.
**19.10 «Няскончаная п'еса для механічнага піяніна». Маст. фільм.**
**20.45** Калыханка.
**21.15 «Снайпер. Зброя помсты». Маст. фільм. 1-я серыя.**
**22.30 «Пышка». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.10, 12.30** Футбол. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
**8.40, 1.00** Футбол. Чэмпіянат свету. 1/8 фіналу.
**13.00** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «ФК Мінск» — «Дынама» (Мінск).
**15.00-23.00, 23.00** Тэніс. Уімблдон.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здарова!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.05** «Яны і мы».
**13.10** «Час абедаць!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Смешнае і яшчэ смяшнейшае».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік. «Дыверсія ў Асіповічах. Іх ведалі толькі ў твар».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05** «Вайна машын. Іл-2. Чорная смерць».
**22.40 Камедыя «У раі, як у пастцы».**
**0.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.40** «Такі лёс».
**12.25 Серыял «Афрамасквіч».**
**12.55** «Вялікі горад».
**13.50** «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў».
**14.50** «Іншая краіна». «Зроблена ў Кітаі».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Мае цудоўныя...».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Смерці насуперак».**
**22.05** «Глядзець усім!».
**23.00** «Ваенная тайна».

### МІР

**5.00** «180 хвілін».
**8.15 Серыял «Генеральская ўнучка».**
**9.55, 1.15 Маст. фільм «Дажывём да панядзелка».**
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Шалёны анёл».**
**14.10** Дак. фільм «Тайныя знакі».
**15.20, 0.00** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.10 Серыял «Будбацька».**
**18.20, 3.15 Серыял «Жураў».**
**21.20 Маст. фільм «Заза».**
**23.10** «Беларусь сёння».
**23.35** «Партызанскі край».
**0.50** «Агульны інтарэс».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.55** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 22.50** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.10** «Расійская гісторыя атручэнняў. Царскія хронікі». Фільм 1-ы.
**16.10** Дак. серыял «Заўтра не памрэ ніколі».
**17.40 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.40 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**21.00 Серыял «Тайны следства-13».**
**23.50** «Зорныя войны Уладзіміра Чаламея».
**0.35 Серыял «Лектар».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.10** «Выратавальнікі».
**8.40** «Да суда».
**9.35, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.55, 13.20** Суд прысяжных.
**14.15** «Пракурорская праверка».
**15.15** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**15.45, 18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.35 Серыял «Глухар. Працяг».**
**20.00 Серыял «Шэф-2».**
**21.40 Серыял «Пляж».**
**23.25** Сёння. Вынікі.
**23.55 Серыял «Таптуны».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.30, 19.00, 20.55, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** Мультпарад. Серыял «Ліло і Сціч».
**7.30 Прыгоды «Выпрабаванне каралеўскага стралка Шарпа».**
**9.20, 17.55 Серыял «Рэванш».**
**10.05, 18.45** «Кінаблакнот».
**10.20 Драма «Лаліта».**
**12.35 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
**14.25 Серыял «У чым віна Фатмагуль».**
**16.30** «Мой любімы гадавалец».
**17.00 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**19.05 Серыял «Добрая жонка».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Дэтэктыў «Набярэжная Арфеўр, 36».**
**23.10 Серыял «Да смерці прыгожая».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.10, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00** «Спытайце кухара».
**10.00** Паспець за 24 гадзіны.
**11.00 Серыял «Сваццproperly».**
**12.00, 20.00 Серыял «Сваццi».**
**13.00, 23.15** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**15.00 Серыял «Фізіка або хімія».**
**16.00 Серыял «Геймеры».**
**18.30, 0.00** «Лаві момант».
**19.00 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».**
**21.10 Камедыя «Пяць нявест». 1, 2 серыі.**

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.10** Навіны культуры.
**9.15, 23.10** «Наглядальнік».
**10.15 Маст. фільм «Не баліць галава ў дзятла».**
**11.35** Дак. фільм «Сяргей Бондзі. Агонь у ачагу».
**12.20** Дак. фільм «Апошнія свабодныя людзі. Вечнае падарожжа».
**13.10 Залатая серыя Расіі. Серыял «Дзве зімы і тры леты».**
**14.10** Тэатральны фестываль тэлеканала «Культура». Спектаклі тэатра «Сучаснік». А. Астроўскі. «Навальніца».
**16.10** «Сусветныя скарбы культуры».
**16.30** Канцэрт МДАСА пад кіраўніцтвам Паўла Когана. Запіс у БЗК.
**18.15, 0.10** Дак. серыял «Улюбіцца ў Арктыку». 1-я серыя.
**18.45** 100 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Чаламея. Дак. фільм «Касмічны ліс».
**19.25** «Добрай ночы, малыя!».
**19.35** Восем вечароў з Веніямінам Смехавым. «Я прыйшоў да вас з вершамі... Аляксандр Блок і Георгій Іваноў».
**20.30** Дак. серыял «Метраном. Гісторыя Францыі». Частка 1-я.
**21.25** Дак. праект «Хлеб і голад».
**22.30** «Кінескоп». XXXVI Маскоўскі міжнародны кінафестываль.
**0.40** А. Брукнер. Сімфонія № 9.
**1.45** Дак. фільм «Валагодскія матывы».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00, 11.00, 17.00** Фестываль «Сан-Рэма — 40». 1990 год.
**6.15** «Аўтограф па суботах». 1993 год.
**6.50** «Капітал-шоу» «Поле цудаў». 1992 год.
**7.40** Дак. фільм «...з удзелам Клары Румянавай».
**8.10** «Вясёлая моладзь». 1985 год.
**9.30 Маст. фільм «Наша дача».**
**12.25** «Да і пасля паўночы». 1988 год.
**13.40** Фільм-канцэрт «Мелодыі лета».
**14.30** Дак. фільм «Рына Зялёная».
**15.05** «Раство ў доме Шаляпіна». 1992 год.
**16.00** «Вакол смеху» «Каханне». 1-я частка. 1980 год.
**18.05** «Будзільнік». 1986 год.
**18.40 Маст. фільм «Дні і гады Мікалая Батыгіна». 1-я серыя.**
**20.00, 2.00** «Мінулы час».
**21.00** «Народжаны ў СССР».
**22.00** «Прывітанне, музыка!». 1990 год.
**23.00** «Аўтарскі вечар Андрэя Дзяменцьева». 1983 год.
**0.10** Дак. фільм «Два капітаны». У. Каверын. 1975 год.
**0.40** Т/фільм «Следства вядуць Знатакі». Справа № 6: «Шантаж». 2-я серыя.
**1.40** Па старонках перадачы «Шынок «13 крэслаў». 1966 год.
**3.00** «Колба часу».
**4.00** «Кінапанарама». 70 гадоў кіно». 3-я частка. 1989 год.

### EUROSPORT

**9.30, 11.45** Футбол. Бразілеманія.
**9.45** Стральба з лука. Кубак свету.
**10.15, 12.00, 15.10, 19.45, 0.15** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі.
**15.00, 18.30, 22.30, 1.00** Футбол.
**15.45, 19.15, 2.00** Веласпорт. Тур дэ Франс.
**16.15, 18.40, 1.35** Веласпорт.
**17.30, 21.45** WATTS.
**22.00, 23.00** Пра рэстлінг.
**0.00** Конны спорт. Скачкі.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 9.00, 13.30, 16.30, 21.00, 2.10** Серыял «Камп'ютаршчыкі».
**5.50** Прыгоды «Дарога ў Марока».
**7.25** Камедыя «Яна некіруемая».
**9.50** Камедыя «Мой лепшы палюбоўнік».
**11.45** Камедыя «Наадварот».
**14.20** Камедыя «Сверб сёмага года».
**16.05** Камедыя «Шукальнік прыгод».
**17.20** Камедыя «Нявеста з таго свету».
**19.00, 21.50, 23.50, 1.50, 4.40** Скетчком «Паміж намі».
**19.20** Камедыя «Зноў у гульні».
**22.10** Камедыя «Банда няўдачнікаў».
**0.15** Камедыя «Цёрнер і Хуч».
**3.00** Камедыя «Мамчын сынок».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.30** «Сардэчна запрашаем дадому!».
**9.10, 18.30, 3.50** Серыял «Небяспечнае каханне».
**10.30** «Паненка і кулінар».
**11.00** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**12.45, 17.30** Дак. серыял «Справа Астахава».
**13.40, 17.00** Дак. серыял «Простыя складанасці».
**14.10** «Жонка. Гісторыя кахання». Алена Проклава.
**15.30** «Сто пытанняў даросламу». Леў Лешчанка.
**16.15, 22.05** «Зорныя гісторыі».
**20.10** Серыял «Мар'ін гай».
**21.10, 5.15** Серыял «Агент». Заключная серыя.
**23.00** Маст. фільм «Рэвальвер».
**0.55** Серыял «Паляўнічыя на чужых».
**1.45** «Асцярожна, махляры!».
**2.15** «Часова даступны». Наталля Рагозіна.
**3.10** «Без падману».

### ТБ1000

**5.00** Трылер «Наркоз».
**6.55** Камедыя «Ну што, прыехалі?».
**8.50, 17.15** Камедыя «Знесеныя».
**10.45** Драма «Крок наперад 3».
**12.50, 0.55** Баявік «Гісторыя рыцара».
**15.25** Трагікамедыя «Тост».
**19.00** Камедыя «Дзеці сексу не перашкода».
**21.00** Драма «Усё самае лепшае».
**22.55** Драма «Асабістае».
**3.10** Камедыя «Страшыдлы».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Фільм-казка «Варвара краса — доўгая каса».
**7.40** Дэтэктыў «Памылка рэзідэнта».
**10.10** Дэтэктыў «Лёс рэзідэнта».
**13.10** Дэтэктыў «Вяртанне рэзідэнта».
**15.40** Дэтэктыў «Канец аперацыі «Рэзідэнт».
**18.25** Камедыя «Той яшчэ Карласан!»
**20.00** Драма «Нябесны суд».
**21.50** Трылер «Фанаграма страсці».
**23.40** Драма «Апошняя рэпрадукцыя».
**3.40** Камедыя «Практыкаванні ў цудоўным».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
**6.00, 12.00** Гульні розуму.
**7.00** Займальная навука.
**8.00, 13.00** Аўта-SOS.
**9.00, 14.00** Аўтарэстаўратары.
**10.00** Машыны: разабраць і прадаць.
**11.00, 18.00** Дзікая будоўля.
**15.00** Акулагорад.
**16.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**17.00, 2.00** Паветраныя асы вайны.
**19.00, 0.00, 3.00** Космас: Прастора і час.
**21.00, 1.00, 4.00** Гульня ў лікі.
**22.00** Навука будучыні.
**23.00** Турэмныя цяжкасці.

### DISCOVERY

**7.00** Голыя і напалоханыя.
**7.50, 12.20** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**8.40, 20.35** Патрабуецца зборка.
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Каралі аўкцыёнаў.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Не спрабуйце паўтарыць.
**13.15, 16.00, 6.05** Махінатары.
**14.10, 3.55** Хуткія і гучныя.
**15.05** Горш быць не магло.
**17.20, 21.00, 3.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**18.15** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**19.10** Круцей не прыдумаеш.
**21.30** Паляўнічыя на склады.
**22.00** Адпетыя рыэлтары.
**22.30** Багажныя войны.
**23.00** Рыбацкія легенды.
**0.00, 5.10** Залатая ліхаманка.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.



Удзельнікі балю з задавальненнем фатаграфаваліся на памяць з рэктарам Сяргеем АБЛАМЕЙКАМ.

■ Бывай, універ!

# ЛЕПШЫЯ НА ЧЫРВОНАЙ ДАРОЖЦЫ

**Дзяўчаты ў вячэрніх сукенках і хлопцы ў парадных касцюмах на чырвонай дарожцы. Гэтых прыгожых маладых людзей аб'яднала свята — урачысты баль лепшых выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У Ліцэі БДУ сабраліся самыя таленавітыя, разумныя, творчыя і неардынарныя.**

У перадсвяточнай мітусні студэнты не губляліся: ёсць час пафатаграфавацца і перакінуцца словам з сябрамі. Мы таксама скарысталіся магчымасцю пагутарыць з **лепшым выпускніком хімічнага факультэта і стыпендыятам Прэзідэнцкага фонду Мікалаем МАЛАШЧОНКАМ.** Былы ўжо студэнт адзначыў, што на факультэце створаны добрыя ўмовы для развіцця навукі, таму ён вырашыў пайсці ў магістратуру. «Мы распрацоўваем альтэрнатыўныя крыніцы здабывання энергіі — сонечныя батарэі, абсталяванне, што ёсць на факультэце, дазваляе праводзіць неабходныя даследаванні ў гэтай галіне», — распавёў Мікалай.

— Колькі разоў за мяжой даводзілася чуць: «Дайце вашых матэматыкаў, фізікаў, хімікаў!» — заўважыў крыху пазней **рэктар БДУ Сяргей АБЛАМЕЙКА.** — Нашы выпускнікі патрэбны паўсюль. Хіба гэта не заслуга грунтоўнай і цэласнай сістэмы адукацыі? БДУ амаль кожны год адкрывае новыя спецыяльнасці, а незапатрабаваных кірункаў у нас папросту няма.

Рэктар падзякаваў студэнтам за выдатную вучобу і пажадаў і надалей трымацца ўніверсітэцкай сям'і. Пасля ўзнагароджвання слова ўзяла **Марыя БАХЦІЯРАВА, выпускніца геаграфічнага факультэта, стыпендыятка прэстыжнай прэміі імя Уладзіміра Вярнадскага.** Грант яна атрымала па выніках конкурсу, які праводзіўся Экалагічным фондам Масквы. «Першае, чаго б мне хацелася пажадаць, — доўгіх гадоў жыцця нашым бацькам, якія заўжды нас падтрымліваюць у хвіліны няўпэўненасці ў сабе, за веру ў нашы сілы, — прамовіла расхваляваная дзяўчына. — Дзякуй выкладчыкам за дабрыню і чалавечае стаўленне да нас, студэнтаў. Калі я стану выкладчыкам, то буду ведаць, з каго браць прыклад: у першую чаргу, з вас, шаноўныя!»

На свяце згадвалі і студэнцкіх лідараў. У многіх выпускнікоў было столькі рэгалій, што вядучыя не паспявалі ўсе іх агучваць. Напрыклад, **выпускнік юрыдычнага факультэта Яўген ХАРУК** мае грамату адміністрацыі Маскоўскага раёна сталіцы «За актыўны ўдзел у рэалізацыі праектаў дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі», з'яўляецца таксама пераможцам конкурсу «Студэнт года БДУ-2013» у намінацыі «Лідар года», сакратаром БРСМ юрыдычнага факультэта. Малады чалавек пажадаў будучым выпускнікам — цяперашнім чацвёртакурснікам, якія таксама прысутнічалі ў зале, рэалізоўваць усе магчымасці, якія прапануе ўніверсітэт. А ў адказ **чацвёртакурснік фізічнага факультэта Павел ЛАБАЦЭВІЧ** заявіў, што яго курс пераняў эстафету ў выпускнікоў і будзе высока трымаць планку.



*А сёння ўвечары адбудзецца Рэспубліканскі баль выпускнікоў. Запрашэнне на сустрэчу з кіраўніком дзяржавы атрымалі 200 лепшых выпускнікоў з 54 беларускіх ВНУ.*

…Агульныя фотаздымкі з дэканамі і рэктарам… Выпускнікі вельмі расхваляваныя, у дзяўчат на вачах слёзы. Добрая нагода разбавіць хвалю суму добрай музыкай. Выступленні сапраўды былі выдатнымі. Мяркую, многім запомніўся нумар **лаўрэата спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі, скрыпачкі Веранікі САЛЬНІК.** Дзяўчына парадавала ўсіх выдатнымі каверамі на хіты рок-музыкі. А выступленне на сцэне Тэа, прадстаўніка Беларусі на сёлетнім «Еўрабачанні», стала своеасаблівым падарункам лепшым выпускнікам ад рэктара ўніверсітэта.

Вядома, выпускны баль — гэта вельмі хвалюючае свята, якое нікога не пакідае абыякавым. «Эмоцыі проста выплёскваюцца», — падзяліўся сваімі ўражаннямі **студэнцкі лідар ваеннага факультэта Сяргей ВАРАНЮК.**

**Кацярына РАДЗЮК.**
**Фота Надзеі БУЖАН**

■ Неасабісты суб'ектыў



# ПОПЕЛ КЛААСА. БЕЛАРУСКІ ВАРЫЯНТ

## ВАЙНА ПРАЙШЛА ПРАЗ ЛЁС КОЖНАГА З НАС. НАВАТ КАЛІ МЫ ПРА ГЭТА НЕ ЗДАГАДВАЕМСЯ

ЗНОЎ пра вайну. Не таму, што для нашага брата-журналіста яна цяпер, наконадні свята вызвалення, — ці не самая ўдзячная тэма. Век бы пра яе не пісаў, бо і праз два пакаленні абыякавым і спакойным тут быць не атрымліваецца… Але пасля выхаду матэрыялу «Уласная справа», у якім разважала пра гістарычную праўду і памяць аб той вайне, якія, акрамя нас, нікому, па сутнасці, не патрэбны, патэлефанаваў чытач і ўзрушана прапанаваў напісаць яшчэ і пра тое, як гэтую праўду і памяць успрымаем мы самі. Аргумент у майго шаноўнага апанента быў такі: маўляў, і ў жыхароў нашай краіны ўспаміны розныя. Бо хтосьці падлеткам трапіў у эвакуацыю ў Ташкент і лічыць жыццё на чужыне і тое, што часам хлеба было не напоўніцу, найвялікшай трагедыяй, а хтосьці тры гады пражыў у акупацыі і спазнаў сапраўдную бяду і жах: голад, холад, у яго на вачах гінулі блізкія людзі, гарэла родная хата… «Згадзіцеся, зусім розныя «вагавыя катэгорыі» ў тых успамінаў», — узрушана даводзіў мой суразмоўца…

А ці ёсць наогул «вагавыя катэгорыі» ў той вайны? Асабліва калі мець на ўвазе не толькі кожнага трэцяга беларуса, які згінуў у яе пекле, але і тых, хто кожнага трэцяга аплакаў, — мацярок, жонак, дзяцей? Вайна не выбірала, і наўрад ці гора ад страты блізкіх у тых, хто быў у эвакуацыі і адразу пасля вызвалення паспяшаўся вярнуцца на родную зямлю, хоць на каліва меншае, чым у тых, хто заставаўся пакутаваць, выжываць і змагацца тут. І словы пра тое, што вайна на нашай зямлі закранула літаральна кожную сям'ю, — не прыгожая літаратурная фраза: яно так ёсць на самой справе.

Бо было яшчэ паняцце — «пасля вайны». Калі радасць ад вызвалення стала часткай біяграфіі і зноў давялося выжываць. На папялішчах, на засеяных мінамі і снарадамі палях. Жанчынам і дзецям. Яны ўпрагаліся ў плугі, каб узараць палетак, раскладалі зімовымі начамі вогнішчы, ганяючы ад вокан галодных ваўкоў, збіралі ўвесну на полі гнілую бульбу (пышкі) і пяклі з іх праснакі, каб пракарміцца… «Гэта добра, што было так шмат клопатаў, што думалі, як выжыць. Інакш бы проста звар'яцела ад гора», — з філасофскім спакоем сказала мне аднойчы бабуля, якая ў дваццаць чатыры гады засталася ўдавой з дзвюма маленькімі дочкамі на руках. Ёй, дарэчы, ужо дзевяноста дзевяць. «Жыву за сябе і за свайго Юстына», — так тлумачыць свой доўгі век. Пахаваўшы мужа, расстралянага ў 1942-м за сувязь з партызанамі, яна так і пражыла ўсе гады адна…

ТАК, нашы дзяды — героі, якія перамаглі фашызм, і гэта — наш найвялікшы гонар. Але нашы бабулі — жанчыны без жаночага шчасця, нашы бацькі — бязбацькавічы, бо фашызм дзяды перамаглі, аддаўшы за гэта жыццё. Гэта таксама страшная жыццёвая праўда той вайны, якая і праз семдзесят гадоў, атрымліваецца, датычыцца кожнага. І праз пакаленні яна не зменіцца — толькі для тых, хто прыйдзе пасля нас, бабулі стануць прабабулямі. І гэтая праўда для нас — як для фламандца Уленшпігеля попел яго бацькі Клааса, спаленага на вогнішчы інквізіцыі: яна заўжды з намі і «стукае ў грудзі».

Так павінна быць, бо ўдовам і сіротам той вайны, якія не здзяйснялі подзвігаў, а проста выжылі, мы не ставім помнікаў. Прынамсі, пакуль што. Можа, мы яшчэ не асэнсавалі, што выжыць, перажыўшы гора, — гэта таксама быў подзвіг? Пра гэта вельмі трапна падчас пасяджэння «круглага стала» ў «Звяздзе» сказаў нядаўна акадэмік Аляксандр Каваленя: «Нашы маці пасля вайны фактычна выратавалі нацыю, не даўшы дзецям памерці з голаду і захаваўшы ў іх духоўны стрыжань. Пра іх трэба пісаць і гаварыць, пакуль жывыя яны, пакуль памяць пра іх жывая. Бо кожная, кожная з іх гэтага вартая…»

…НЯДАЎНА, седзячы ў кампаніі незамужніх сяброўак, якія ўсе як адна — прыгажуні і разумніцы, разважалі, дзе тое жаночае шчасце заблукала. І прыгадаўся раптам непрыдуманы дыялог дзядулі з унучкай, у нашай жа «Звяздзе» калісьці прачытаны. Дзед-вэтэран настойліва пытаў унучку, чаму яна ў свае дваццаць сем не замужам. А дзяўчына сур'ёзна так яму адказала: «Вось ты з вайны вярнуўся жывы, і нарадзіўся мой бацька, а ў яго — я. А ў майго суджанага дзед з вайны не вярнуўся, таму і ён не нарадзіўся…»

А вы кажаце, вайна з кожным годам далей…

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**


**Считать недействительными**

страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:

- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 1206339, 1263186, 1062404, 0938253, 0938254, 1212430, 0862369, 1141546, 1272993, 1272998, 1272999, 0890832, 0982973;

- добровольное страхование от несчастных случаев (2РН, 2РП) серия НС № 0003871;

- квитанция 1 СУ серия КС №№ 4282763, 4286030, 4286039. *УНП 100782388*


■ Дзеля памяці

# ЧАС УЗНАЎЛЯЕ КУПЮРЫ

## У МІНСКУ ПЕРАВЫДАДЗЕНЫ НАЙБОЛЬШ ЛЁСАВЫЗНАЧАЛЬНЫЯ АПОВЕСЦІ НАРОДНАГА ПІСЬМЕННІКА БЕЛАРУСІ ВАСІЛЯ БЫКАВА. ЦЯПЕР УЖО — БЕЗ ЦЭНЗУРЫ

**«Мёртвым не баліць». Першыя публікацыі — у часопісах «Маладосць» і «Новый мир». «Сотнікаў» — наадварот: спачатку аповесць была надрукавана ў «Новом мире», пасля — у «Полымі». Самыя пранізлівыя па ўваходжанні, урэзванні ў жыццё творы. І самыя драматычныя па характары сваіх уласных лёсаў.**

Калі пры ўсіх варыянтах «Мёртвым не баліць» — аўтарская назва, то «Сотнікаў» і пры передачы ў друк меў іншае «аблічча» — «Ліквідацыя». З такім тварам аповесць прыйшла і ў «Новый мир». «…твор гродзенскага пісьменніка з'явіўся ў «Новом мире» (№ 5) — пад назвай «Сотнікаў», якую даў Аляксандр Твардоўскі і якая Быкаву абсалютна не спадабалася. «Чаму — Сотнікаў? Ужо з увагі на двух герояў трэба — Рыбак і Сотнікаў, — задаваўся ён пытаннем. — Але мне патлумачылі, што так лепш — паводле прозвішча станоўчага героя. Галоўны, маўляў, меў на яго адмысловыя спадзяванкі, — мусіць, гэткія, як і аўтар».

Выданні, якія здзейснены сёння, істотна адрозніваюцца ад усіх тых, што былі вядомыя шырокаму колу чытачоў у ранейшыя гады. У аповесці «Мёртвым не баліць», якая і пасля часопіснай публікацыі (ад 1966 года), амаль 20 гадоў знаходзілася пад забаронай, вернута 200 (!) купюр, зробленых савецкай цэнзурай. Выкідваўся «страх берыяўшчыны». Выкідвалася і такое: «Франтавая таварыскасць з'яўляецца зарукай добразычлівасці, без ценю карысці або ўзаемаразлікаў». «Часы мяняюцца. Вы хацелі паесці сыта. А мы — жыць справядліва. Невялікая, але ўсё ж розніца». «Вядома, ён нахабнік і шкурнік, варты пакарання. Але калі б не той стрэл. Стрэл усё заблытаў. Гэта — забойства. А ці меў на яго права Сахно? Ці не ад бессардэчнасці тое? Ад жорсткасці? Толькі таму, што яму так зручней? Ці не заб'е ён так і мяне? І Юрку? Калі гэта спатрэбіцца?»… І ўсё ж пры мностве купюр Васіль Быкаў здолеў шмат што сказаць па тым часе пра Вялікую Айчынную. І ўвогуле пра чалавека на вайне — шмат новага і невыказанага раней. Чытача ўразілі, відаць, не факты. Тысячы, мільёны людзей трымалі ў цянётах памяці шмат рознага і трагедыйнага.









Жывым было пакаленне, якое і бачыла шмат чаго, і нацярпелася, і сваімі жыццямі заплаціла за штодзённыя крывавыя выпрабаванні. Справа, пэўна, была ў іншым: пісьменнік сказаў тое, што многія і не выказвалі, а маўкліва перажывалі, часам стараючыся і ў думках не жыць з гэтым, маўкліва аддавалі на спажыву сэрцу, сваім душам. І, мусіць, не таму, што не знаходзілі слоў… Прычыны найперш — ва ўласным страху. Перад маштабамі трагедый, перад часам, які прывучыў да верхавенства безразважлівай самаахвярнасці.

Купюры далі «зялёнае святло» часопісным публікацыям. Пісьменнік, зацікаўлены ў зносінах з чытачом, вымушана пайшоў на многія кампрамісы. Але і купюры не пазбавілі аўтара ад той напорыстай, агрэсіўнай крытыкі, якая навалілася не проста на твор як на падзею, мастацкую з'яву, а ўсім сваім артадаксальным цяжарам ударыла па Васілю Быкаву. Ударыла па Салдату Вайны з гармат, накрыла яго выбуховымі хвалямі, пачала расстрэльваць ва ўпор. Цяпер можна гаварыць пра тое, што дзясяткі публікацый і прамалінейныя вусныя прапрацоўкі загартавалі пісьменніцкі і грамадзянскі характар Васіля Уладзіміравіча. Але гэта — цяпер… Тады, у другой палове 1960-х і пазней, пасля публікацыі «Сотнікава», аблога вакол творцы была настолькі магутная, што, здавалася, трэба было мець надзвычайную мужнасць, каб вытрымаць і не здацца. Каб не патрапіць у палон псеўдапатрыятычнасці і псеўдаграмадзянскасці. Народны паэт Беларусі і вялікі, сапраўдны сябар пісьменніка Рыгор Барадулін сказаў пра гэта ўзнёсла-эмацыянальна і надзвычай ясна і праўдзіва (сказаў ці не за дзесяць гадоў да смерці аўтара «Сотнікава»): «Як асоба Васіль Быкаў нараджаўся пад вялікім ціскам, — так утвараюцца горы, так утвараецца цвёрдая парода. Лёс не рассцілаў Быкаву самабраных абрусаў. Быкаву ніколі і нідзе не было роўнае, гладкае дарогі. Па жыццёвых лужынах, па ідэалагічных калдобінах ці, лепей бы сказаць, спаміж воўчых ямаў ступала нага пісьменніка, а душа ягоная, думка ягоная паломнічала ў небе ісціны, у вышыні існасці. Сотні разоў лёс выпрабоўваў дапытніка на «разрыў». Вытрымаў, вытрываў, выявіўся».

Новыя выданні «Мёртвым не баліць» і «Ліквідацыі» («Сотнікава») надзвычай цікавыя каментарыямі Сяргея Шапрана, які ў апошнія гады зрабіў неверагодна шмат для расповеду пра жыццё і творчасць Васіля Быкава ў самых драбнюткіх падрабязнасцях. У томе, які прадстаўляе другую са згаданых аповесцяў, ёсць і стэнаграма (быкаўская!), дакладней — запісы тэзісаў абмеркавання аповесці на рэдкалегіі часопіса «Полымя». Лаканічныя, часам скарочаныя да кароткіх пазнак нататкі Васіля Уладзіміравіча Сяргей Шапран стараецца расшыфраваць вельмі дакладна. З тых запісаў відаць і пазіцыя многіх. У Анатоля Клышкі такое перакананне: «Несфарміраваная асоба ў нечалавечых умовах прыводзіць да здрады. У гэтым яе каштоўнасці…» Іван Шамякін: «Увесь упор аўтар робіць на даследаванне жывёльнага страху. Я за тое, каб друкаваць».

Выданні без купюр, якія ўжо, несумненна, стануць і прадметам гісторыка-літаратурнага, літаратуразнаўчага досведу, — усё ж з тых, што прымушаюць наноў, спакойна, прыўзняўшыся над часам, перачытаць «Мёртвым не баліць» і «Ліквідацыю» (альбо «Сотнікава»). Прачытаць і падумаць. І ўжо таму работу выдаўцоў (над тым, каб кніга прыйшла да чытача, працавалі ў «МЕДЫЯЛе») і Сяргея Шапрана варта назваць сапраўднай падзеяй у кніжным, літаратурным жыцці Беларусі.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА**


**КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»**

**на III квартал або II паўгоддзе 2014 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце ДА 5 ЛІПЕНЯ 2014 ГОДА ў рэдакцыю на адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**





Сярод падпісчыкаў 11.07.2014 года будзе разыграна 7 сушылак для агародніны і 3 трымеры. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 21.07.2014 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.09.2014 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2014 г. і пашпарта. Пасля 31 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Тэлефон для даведак (017) 287 18 38.**

**ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — З 5.06.14 ПА 30.09.14.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2376 ад 23.05.14, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

**6 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2014 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ____________________
(аддзяленне сувязі)

____________________ **на III кв. або 2–е паўг. 2014 года**

**Хатні адрас і тэлефон** [ ] ____________________
(індэкс)

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

ЗВЯЗДА. Да чытача з любоўю!

**Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**






## УРОК СПРАВЯДЛІВАСЦІ

У нашых школах у лютым ладзяцца вечары сустрэч з выпускнікамі. Колькі ж радасці ад іх (і вучням, і настаўнікам), колькі ўспамінаў!

…У шостым класе я сядзеў за партай побач з адным хлопцам. Звалі яго, як многіх, Валодзя, а вось прозвішча было досыць незвычайнае — Кібілда. Ён ім вельмі ганарыўся і якраз тады, дзе толькі мог (дома, на ўроках, на перапынках) удасканальваў свой подпіс. Мусіць, горы паперы скрэмзаў рознымі там кручкамі, але ж руку набіў. Ды так, што потым спыніцца не мог: стаў распісвацца за іншых хлопцаў і дзяўчат. А потым узяўся і за настаўнікаў. У прыватнасці, подпіс «русіцы» падробліваў так, што не адрозніш.

Мне, вядома ж, зайздросна было і таксама карцела павучыцца, паспрабаваць.

Дык вось. Канец урока рускай мовы. «Русіца», настаўніца Валянціна Сцяпанаўна, як на тое ліха, праходзіць па радах, збірае для праверкі сшыткі. Спыняецца каля мяне. А я ж свой сшытак аддаць не магу, бо, спасцігаючы навуку падробкі подпісаў, скрэмзаў і вырваў з яго лісты. Але гэта — па-другое. А па-першае… Дамашняе практыкаванне я выканаў дрэнна і таму крыж-накрыж перакрэсліў яго, паставіў двойку і… распісаўся за настаўніцу.

Не помню, колькі цягнулася паўза. Валянціна Сцяпанаўна, што называецца, стаяла над душой, я — хаваў за спінай сваю правіну.

— Дай, — нарэшце загадала яна.

Што было рабіць — паслухаўся, аддаў сшытак. Настаўніца тут жа разгарнула яго (і трэба ж — на патрэбнай старонцы!), знячэўку пачырванела, але ўголас не сказала нічога, бо якраз зазвінеў званок.

Не помню, як дажыў я той дзень.

А назаўтра выклікаюць мяне ў настаўніцкую. Ногі як з ваты — не трымаюць зусім, але ж заходжу. Чую з парога працяжнае, грознае:

— Та-ак, малады чалавек…

Гэта, ведаю, дырэктар (па мянушцы чамусьці Прапаршчык)…

—… падробкай дзяржаўных дакументаў вырашылі заняцца?!

Стаю, дрыжу, гляджу, куды б праваліцца… Але пры гэтым краем вока ўсё ж такі бачу, што дырэктар з маім сшыткам стаіць ля стала, а іншыя настаўнікі сядзяць на канапе, можна сказаць, паблізу, і твары ў іх добрыя.

— Ну ён жа не пяць сабе паставіў, — чуецца адтуль.

— І сапраўды… Ён сваю працу сумленна ацаніў…

— Дарэчы, а што б вы яму паставілі, Валянціна Сцяпанаўна?

Карацей, ідзе там ціхая размова, «узважваюць» настаўнікі мой учынак — чым ён добры, чым дрэнны… Я ўсё-усё разумею. І, вядома ж, болей не буду…

Хвілін праз колькі адпусцілі мяне, што называецца, з мірам. Але самае галоўнае, пасля гэтага Валянціна Сцяпанаўна Шалабасава, настаўніца рускай мовы і літаратуры Голдаўскай сямігодкі Лідскага раёна, стала неяк па-добраму прыглядацца да мяне, хваліць за правільнае вымаўленне, за добрае сачыненне…

З часам гэта яе ўвага вылілася ў тое, што я таксама стаў настаўнікам рускай мовы і літаратуры.

Цяпер ужо на пенсіі. Больш чым шэсцьдзесят гадоў прайшло пасля таго выпадку, але я па-ранейшаму зрокам памяці бачу тую канапу, дзе сядзелі настаўнікі, помню ці не першы ў сваім жыцці ўрок паразумення, спагады і справядлівасці.

**Л. КАВАЛЬЧУК,**
*г. Жодзіна.*

## МАСТАЦТВА ПАТРАБУЕ АХВЯР

Працы, тупаніны ў вёсцы — непачаты край і, здаецца, заўсёды, але ж доўгімі зімовымі вечарамі вольнага часу больш. І тады…

Гэта цяпер мы сядзім ля тэлевізараў ды камп'ютараў, а вось нашы бацькі — не: дагледзеўшы гаспадарку, яны збіраліся ў клубе… Яшчэ і для таго, каб развучыць новы танец, паспяваць, правесці чарговую рэпетыцыю, а потым выступіць з канцэртам перад людзьмі.

Дык вось пра чарговы.

Зала паўнюткая. На сцэне — самадзейныя артысты: спяваюць пра будзёнаўскіх байцоў, пра маладога агранома, пра Яся, што касіў канюшыну, чытаюць на памяць вершы.

На чарзе — сцэнка з вясковага жыцця: муж мала таго што прывалокся дадому п'яны, дык яшчэ і просіць дабаўкі. Жонка яму, вядома ж, кукіш! І на словах дадае, што той — п'янюга, што гультаіна, што ўсю кроў з яе выпіў, што дурань…

Крыўдзіць, карацей, свайго мужыка. Вось ён і бярэцца не то пастрашыць яе, не то папярэдзіць: хапае вяроўку, усоўвае галаву ў пятлю…

Ну а далей… Жонка, убачыўшы гэта, з лямантам «Ратуйце!» выбягае на вуліцу, суседка на крык залятае ў хату і, убачыўшы, што там анікога (вясельнік не ў залік) — шусь да кубельца з салам: вечка падняла і апошні кавалак — сабе за пазуху.

А «нябожчыку» ж крыўдна. Ён з-пад столі голас падае:

— Эй, баба… Ты ж сумленне май… Хоць на закусь скрылік пакінь…

Суседка — вобзем. А гледачы, вядома ж, у рогат — у ладкі пляскаюць, аж сцены ў клубе дрыжаць.

Акцёрам, здавалася б, самы час цяпер пакланіцца ды за кулісы, але маміна сяброўка (тая, што ролю «нябожчыка» іграла, бо ніхто з мужчын не хацеў) па-ранейшаму «вісіць». І вочы ў яе па яблыку… І язык — на баку.

«Во малайчына — так у ролю ўвайшла!», «Сапраўдная артыстка!», «Гэткі самародак прападае! Ёй хоць заўтра ў сталіцу, у тэатр», — шумяць гледачы. А таго не ведаюць, што падчас падрыхтоўкі гэтага «спектакля» яшчэ адзін талент праявіўся: пятлю адзін з вяскоўцаў завязаў так, што ўлезці ў яе — раз плюнуць, а вось вылезці…

Кажуць, мастацтва патрабуе ахвяр. Маміна сяброўка і сапраўды ёю ледзьве не стала. Але гледачы гэтага не заўважылі. Яны былі ўдзячныя самадзейным артыстам за іх творчасць, за іх жаданне прыблізіць тэатр, упрыгожыць жыццё.

**Таццяна РАМАНАВА,**
*г. Наваполацк.*

## ГРАФІН

Гэта гісторыя адбылася ў рэдакцыі адной гарадской газеты. Рэдактар там неяк сказаў свайму намесніку:

— А прынясі ты мне вады, Рыгор Данілавіч.

— Гэта мы зараз, Пятро Андрэевіч, — падхапіўся той.

І графін са стала ўзяў. Аднак, выйшаўшы з кабінета, падумаў: «А сакратарка ў нас на што?.. Я хоць і намеснік, але ж ваду шэфу падносіць не стану».

З гэтым ён паставіў графін на стол у прыёмнай. Сакратарка яго, вядома ж, убачыла. Падумала яшчэ: «Ну добра, шэфу — то кавы, то гарбаты. А тут яшчэ і намесніку?.. Ды яму толькі моду пакажы… Не на тую напалі!»

Карацей, абурылася кабета і занесла графін у аддзел палітыкі.

Супрацоўнікі яго таксама трохі здзівіліся, бо сакратарка ж, як ты ні круці, ім не начальніца… Таму графін яны перадалі ў аддзел гарадскога жыцця.

Але хадзіць па ваду там таксама не выпадала, і графін апынуўся ў аддзеле культуры.

— Мы, безумоўна, людзі інтэлігентныя, — адзначылі пра сябе тамтэйшыя дзяўчаты, — але ж не настолькі…

У кабінеце вёрсткі ўсе шчыравалі над новым нумарам, таму графін аддалі прыбіральшчыцы, якая прыходзіла з заявай на адпачынак. «Гэтага мне яшчэ не хапала — ваду ім насіць», — пакрыўдзілася кабета і аднесла графін… назад у прыёмную.

Туды (і якраз жа ў гэту мінуту!) са свайго кабінета выйшаў рэдактар. Убачыўшы, што графін па-ранейшаму пусты, ён вырашыў, што намесніка некуды выклікалі, і пайшоў па ваду сам. А паколькі пачаўся абед, то сакратаркі на месцы не было, і куды знік графін, ніхто не ўбачыў…

Вярнуўшыся з абеда і згледзеўшы, што графіна з вадою няма, намеснік выклікаў да сябе сакратарку:

— Дзе графін? — спытаў у яе. — Шэф патрабуе.
